КАЛОСЬСЕ



I

ВІЛЬНЯ 1939

„KAŁOŚSIE“ — KWARTALNIK LITERACKO-NAUKOWY

«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.

— Асобная кніжка — 50 гр. Заграніцу 3 зл. 20 гр.. —

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.

«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.

«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Зьмест кніжкі 1 (18) „Калосься“

(Працяг зьместу на 3 бач. вокладкі)

Drukarnia Białoruska im. Franciszka Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

КНІЖКА 1 (18). СТУДЗЕНЬ—ЛЮТЫ—САКАВІК, 1939. ГОД V.

МІХАСЬ МАШАРА

З цыклю —

Ваколіца сініх балот

Зімовая песьня

1

Замёрлі ваколіцы сініх балот...
Сухая сіта і асокі шумяць.
Трывожна і сумна...
Заціхлі пад лёдам
прасторы балот
і вазёрная гладзь.

Накрыліся белым абрусам імшары...
Уладаркай прышла на балоты зіма.
І воч не падняць мне пад нейкім цяжарам
і нейкая сьцюжа на сэрца лягла.

Таптаныя сьцежкі,
дарожкі і тропы
напроста вядуць да сялянскіх сяліб,
дзе ўецца дымок над саломянным стропам
і хаты глядзяцца
бяльмом нямых шыб.

Мяцель завірыцца ў шалёным разгоне,
ляцяць табуны белагрывых каней
і стогне,
і плача,
і песьнямі звоніць, —
і гора таму, хто спаткаецца з ей.

2

Зімовая песьня...
Сьнягі і марозы...
Ну як тут вясёлым і радасным быць?
Пяю белапенным у полі бярозам,
вучуся у сэрцы людзкія званіць.

Ў ваколіцах сініх балотаў ёсьць людзі
і сэрца іх б'ецца,
і вочы гараць,
ды некалі нехта душу іх запудзіў,
наўчыў іх зьвярыную долю кахаць.

Праклятае ўчора...
і шэрае сяньня,
а заўтра загадкай у далях стаіць,
хтось зблытаў ім думы,
і зьмест,
і пытаньні
і кінуў па сініх балотах блудзіць.

3

Так многа на сьвеце
ваколіцаў сініх...,
бяз ліку нязнаных вазёр і балот.
Сягодня мяцель карагодзіць над імі
агнём ападаючых зораў на лёд.

Зьвярыныя тропы
занесены сьнегам.
Ваўчыца брыдзе па здабычу да хат.
Жыцьцё не застрашыць
пагрозай і сьмехам,
а голад ня пусьціць вярнуцца назад.

Так многа на сьвеце
бяздомных і босых
ў спакоі пад сьнегам заснуўшай зямлі.
Мо' лёс ім і долю украў хто з пад носу,
а мо' яны рана на сьвет наш прышлі?

Пытаньні... Пытаньні...
Ну хто тут паможа
адказу шукаць
і знайсьці на усё?
Вузлы не разьвяжаш —
разтнеш хіба ножам —
вузлы, што вязалі вякамі жыцьцё.

4

Вучуся спакою,
як сьнежнае поле,
і сэрцу гутору: —
зьмірыся, маўчы, —
каб дум ня муцілі —
ні бунты,
ні болі
на млечным узоры зімовай начы.

Хацеў-бы я выславіць песьняй Краіну,
дзе многа вазёраў, пяскоў і балот,
і сэрцам паэта
і чуласьцю сына
адчуць пад сьнягамі жывы веснаход.

І кожную радасьць,
і кожнае гора
з пад стрэх саламяных
як птушку злавіць,
жыцьцём Яе вёсак, палёў і пastораў
у сэрцы людзкія
як звонам званіць.

. . . .

Зімовыя песьні
сьпяваюць мяцелі,
руччы і крыніцы пад лёдам усе,
і шэрыя будні за столам заселі,
а ў сэрцы ўсьцяж думы
аб сьветлай вясьне.

5

Брыду па прасторах балота і моху...
Марозы скавалі навокал усё...
І неяк ня шкода
нічога — ні троху,
і неяк ня страшны —
ні сьмерць, ні жыцьцё.

Я знаю, што гэта ня сьмерць над Краінай,
а толькі зіма,
як штогод над зямлёй.
Вясны дачакае, хто моцны і зьвінны,
хто сэрца напоіць з крыніцы жывой.

6

Ніхто яшчэ сініх балотаў ня мерыў,
апроч тольki ветру ціхога зімой,
а ўсёткі-ж глыбока і шчыра я веру —
яны закрасуюцца іншай красой.

Прыдуць сюды людзі з упартаю воляй,
разрэжуць балоты —
уздоўж і удаль,
на тропах зьвярыных
імпэтам вясёлым
зазвоньюць машыны
і вострая сталь.

I песьні другія пачуюць прасторы,
і новую радасьць сюды прынясуць,
і выкінуць скарбы на бераг вазёры
і сонцам разквеціцца
дзікая жудзь.

. . . .

Зімовая песьня
аб сініх балотах...
За вокнамі вецер махае крылом.
Плывуць мае думы
нямым карагодам
над роднай Краінай
і сонным жыцьцём.

„Ваколіца сініх балот"
Зіма, 1939 г.

А. БЯРОЗКА

* * *

Сягоньня
　　　　　Ты гэтак блізка прайшла;
па лахмоцьці у мораку шэрым
бела, ціха і грозна
　　　　　　　　　　магільны павеяў холад.

. . . .

А ёй—шаснаццаць вёснаў із вачэй глядзела!—
ад вуснаў моладасьць лунала кроўю
і сьпелі яблыкамі грудзі пруткія.

Ўсю ноч над ёю вісла Ты нячутна —
надзею ледзяніла подыхам. Я ведаў: Ты магутная —
перад Табою долу гнецца цьвет
і белае імя Тваё, як ціш.

Яе маці схілілася — і ўтуліўшы ў далоні твар
маўчала. Нема з паміж пальцаў каравых
скацілася чыстая іскра.
　　　　　　　　　　　«Мама, чаму ты плачаш?»

Ўстрапянулася маці. Ў ірдзеньні дымнае лямпы
твар адкрыўся глыбока збарозьнены, жоўты.
　　　　　　　　　　　«Я, дзетка, ня плачу... ня плачу».

Што-ж... Мо' паверыла. Ўзноў адчыніла вочы:
з вачэй яе шаснаццаць вёснаў глянула
і воля — жыць! — ў бязсіле скамянелая...

. . . .

Ў акно сачылася заранўняе сьвятло,
на шыбах палячы іскрыстыя грамніцы.
А на званіцы
ударыў звон. Глухі. Хаўтурны.

19.IV.1938.

СЯРГЕЙ ХМАРА

Контрабанда

Дванаццаць разоў вылазіла з белых апараў кажангарадзецкіх баген сонца. Дванаццаць разоў прыхадзіла на зьмену яму чорнакрылая ноч недзе з пад Пінска...

А іх ня было!

Трывожна перашэптываліся прытуліўшыяся палахліва да зямлі Марачанскія адрубы.[1])

Хіба ўзялі!...

Уздрыгвалі ад кажнага стуку ўвечары поўзаючыя быццам сонныя па хатах жанчыны.

У вачох ўспыхваў раптам радасны вогнік. Але дзьверы не адчыняліся.

. . . .

Панас напружыўшы сілы схапіўся рукамі за лазовыя кусты, пацягнуў за сабою чайку разам з Сымонам. За імі хапаючы рукамі за чарот і папіхаючыся грэбкай[2]) сунуліся па пусташы[3]) Яхім з Імполям.

Ноч быццам глейкае нейкае цеста ахапіла чайкі і людзей. Ціха шапацелі пад ветрам сылягі.[4]) Вочы пільна зорылі густую цемру. Вушы лавілі падазроныя шорахі.

— Каб толькі прайсьці незаўважаным Гнілую Просьць![5])

У балотах недзе зангралі начуючыя па дарозе на поўдзень вяселікі.[6]) Плюхнула пад нязручным ударам Імполевай рукі грэбка. І сьлепячы, белы прамень рэфлектара забегаў па вадзе. Грозна затукацеў рухавік матароўкі.

Яны былі адкрытыя! Засядка!

Пад ударамі грэбак сьміганулі стралою контрабандысцкія чайкі, поручы чорную тонь просьці. Узьбіваючы стаўбы шумавіны кінулася ў здагон чайкам вартаўнічая матароўка пагранічнікаў. Зарагатаў злым сьмехам раптоўна кулямёт. Бзынкнулі пчоламі недзе блізка кулі, шалесьцячы ў трасьнікох.

— Барджэй! Барджэй! Абы да пусташы!

Чайкі імкнуліся па вадзе быццам гонкія скорсы.[7]) Яшчэ сэкунда, яшчэ міць[8]) і чайкі з разгону ўбіліся ў зялёныя гушчары трасьнікоў. Панас страмгалоў бухнуўся ў багна і папоўз тонучы па пояс між чаротаў. За ім паўзла пазасталая тройка.

---

1) Адруб — палескі дыялект — хутар.
2) Грэбка — вясло.
3) Пусташ — заросьлі на вадзе.
4) Сыляга — вербалоз.
5) Просьць — рукаў ракі.
6) Вяселік — жораў.
7) Скорсы — нарты.
8) Міць — мамэнт.

Дарма бегаў вярхамі трасьцін прамень рэфлектара, пяялі песьцьліва кулі.

Контрабандыстыя зьгінулі.

. . . .

Вязнучы па пояс у вадзе, між бязьмежнага мора трасьціны зрабілі нараду.

— Будуць шукаць! Цяпер ужо паднятае ўсё пагранічча. Трэба глыбей зашыцца ў трасьнікі і чакаць. Па пару днёх супакояцца — тады праскаўзьнём да хаты.

Сінія губы ледзь парушваліся з холаду. Быццам у шухлі[1]) целам прабегала дрыготка.

Расьцьвіло.[2]) Высока над трасьнікамі і сылягавымі зарасьлямі паказаўся ў небе гайстар[3]). Плёсамі,[4]) вышарамі[5]) перабіраліся чатыры чалавекі, падобныя хутчэй на нейкія здані, чым на людзей. Правальваліся ў зрадзецкія каловы,[6]) у калугі[7]) чырвонае руды, ратуючыся выламанымі доўгімі альховымі ключкамі[8]) трыманымі ўпапярок сябе. Замест белых катанак[9]) былі нейкія чорна-жоўтыя сплываючыя вадой і балотам лахманы. З чорных траваў блішчэлі гарачкавым агнём зацятыя вочы. Нарэшце — сухшае месца астраўка заросшага хмызьняком.

Адпачынак. У Імполя засталася нейкім чынам на баку варэня.[10]) Хутка праглынулі па калянцы[11]) хлеба з грудкаю[12]) масла і ўзноў у паход. Кігікалі над галовамі спалоханыя чайкі.

А недзе на абедзе[13]) над трасьніковым морам чырчэў дапатопнаю істотаю самалёт, зорка выглядаючы ўцекачоў.

. . . .

А калі трэба было варочацца ўжо назад да хаты, калі ня стала і акрушыны хлеба ў Імполевай варэні, калі Сымона схапіў прахват[14]) і ён пачаў гарачкаваць, яны зблудзілі. Панас з перапалохам сьцьвердзіў, што яны калуюць варочаючыся да таго самага месца. На небе навісла навалач[15]), закрыўшае сонца, па якому можна было-б шукаць напрамку. Балотныя смугі вады крыжаваліся, перапляталіся між сабой. А ракі ня было!

---

1) Шухля — трасца.
2) Расьцьвіло — разьвіднела.
3) Гайстар — чорны бусел.
4) Плёс — дрыгва.
5) Вышар — зарасьлі чароту.
6) Калова — гразкае месца.
7) Калуга — калужа.
8) Ключка — кій.
9) Катанка — сьвітка.
10) Варэня — бочная торба з лазы.
11) Калянка — луста.
12) Грудка — кусок.
13) Абед — поўдзень, паруску — юг.
14) Прахват — прастуда.
15) Навалач — засьціл хмарамі неба.

Голад і перапалох пыткаю[1])падганялі зьняможаных людзей.

І яны зноў паўзьлі цераз плёсы, грузьлі ў каловах, правальваліся праз зрадлівы зялёны кілім у халодныя крынічныя бяздоньні.

Сымон залёг зусім. Трэба было астанавіцца!

І зноў ноч перабытая ў лазовых кустах над калугамі жоўтае руды, з нязьлічанымі раямі камароў, распухшымі ад укусаў тварамі.

На раніцу — яшчэ гарэй. Пад зялёным морам вышароў — белае мора густое, лепкае імглы. Сымон няпрытомны.

Плакалі, скіглілі недзе чайкі.

Будзем нясьці хворага. Трэба-ж ісьці! Асэ ліха![2])

Хворага на плечы і па купінах уперад, падаючы што некалькі крокаў. Няма сіл! А тут багна, трэ' паўзьці, хворага цягнуць. Харчыць папярхнуўшыся вадой дрыгва, штораз страшнейшая. Трэ' варачацца. Капаюць сьлёзы з запухшых вачэй Імполя. Яхім пачынае крычаць, дзіка, страшна. Белае малако імглы палыквае крык.

— Перачакаць імглу!

. . . .

На сёмы дзень Імполь кінуў таварышоў і са зьвярыным жахам у вачох папоўз згінуўшы ў вышарах.

Сымон дагараў. Панас паіў яго носячы ў шапцы з крыніцы ваду і карміў пупшамі лазы і сэрцавінай сітоўніка, разжоўваючы іх папярэдня ў сваіх вуснах.

Самі карміліся сітоўнікам, а потым жабамі. Агня ня было.

. . . .

Імполь лёг і плача. Плача ціха, балюча. Твар аблеплены сотнямі камароў. Увесь у крыві і балоце.

Панас сядзіць на купіне:

—Уставай! Мусім-жа дайсьці. Уставай! Трасе за плячо Імполя. — А сам так ахвотна паклаўся-б, каб ужо не ўставаць.

Раптам Імполь падымаецца і наслухоўвае:

— Чуеш! Сабакі брэшуць! Чуеш! Людзі! — і кідаецца стромгалоў у мора імглы. За ім бяжыць Панас. Сабак ня чутно... Але Імполь чуе. Во! Во!

А' но дабяжаць![3]) Спатыкнуўся, папоўз і раптам хлабыснуў, прарваўшыся ў бяздоньне, разьдзіраючы паветра дзікім крыкам. З жахам адкінуўся назад Панас і завыў: Імполь,— Імполь!

Імполя ня было!

Над бяздоньнем курылася імгла.

. . . .

1) Пытка — бізун.
2) Асэ ліха — вось ліха.
3) А' но дабяжаць— толькі-б дабегчы.

Штораз больш пераконваўся Панас, што ён ключыць на адным месцы. Дні здаваліся гадамі... Ачхнуўшыся ад няпрытомнасьці пачынаў упарта паўзьці ўперад, нічога ўжо ня бачучы перад сабой. Рваў жменяй сітоўнік і жуў яго паўзучы. Правальваўся ў каловы. Пералазіў цераз нейкія стругі вады. Ізноў поўз. А вусны ўпарта, бяспрытомна шапацелі:

— Мушу-ж дайсьці! Мушу! Асэ ліха!

Ня помніў, колькі мінула дзён гэтае страшнае вандроўкі. Ня помніў, чаму ён трапіў між трасьнікі. У вушох пачалі раздавацца галасы жонкі, дзяцей. Здавалася часам, што ён у хаце. Сьмяяўся няпрытомным сьмехам, гаварыў. Потым усё зьнікала. І ён знову поўз.

Адчыніў вочы. Ноч. Раптам недзе з боку бліснуў прамень рэфлектара, зататахаў рухавік матароўкі. Ачуняў.

— Людзі! Ратунак!

Ускочыў напружыўшы шалёна сілы і зноў упаў. Папоўз, дзіка, зьвярына выючы:

— Гу-гу—гу-у—гу-у.

Рукі трапілі на нешта мяккае, вязкае. Апошнімі ўсілкамі сьведамасьці рвануўся, каб падняцца. Ногі лёгка паплылі недзе ўніз, грудзі аблапіла разварушаная дрыгва. Абапёрся рукамі.

— А-а-а — а-а-а! — забульбаталі на паверхні каловы бульбаткі. Недзе здалёк па вышарах бегаў прамень рэфлектара.

. . . .

А ў адрубох неспакойна спалі контрабандысцкіх жонкі. І сьніліся ім мужыкі з поўнымі торбамі пакупак за зробленыя кантрабандай грошы. Сьніўся ім хлеб — звычайны, чорны хлеб, каторы нарэшце будуць мець, — і аполец сланіны.

А дзецям сьніліся ладныя выпечаныя з цеста і размалёваныя пагранічнікі, якіх папрывозяць іхныя Таткі з Пінска.

Жаласьліва завыў на панадворку Панасаў сабака. Зашумелі аб нечым прыпяцкія трасьнікі.

Мы

Нeяк рвуцца ўсьцяж словы—
верш
гамезьлівы
штось,
бо
ў гароце вясковай
атрымалі мы
хрост.
Жадных правіл!
асноваў!
Гэта —
чорт знае,
што!!
Лапцем
лезе
лазовым,
брудзіць нам —
хараство.
Мовіць пэўна
трэ'
шчыра:
...Між нарцызаў
— асот!
Так!
Між пэрлаў
настырай
крыві краплiны...
пот.
I...
праз краты,
праз дроты
заскарузлай рукой
на Парнасе
Ілоты
узьнялі непакой.
Што-ж!
да зьвягі
— прывыклі!
Не саб'юць!!!
Сталь—ня шкло.
Мы
Сябрыны Вялікай
Маладая Ўскалось.

Хоць
    і
        рваныя словы,
кантаватасьці скрозь —
    час,
стагодзьдзі што ломіць,
ў нашым вершы
                урос.
Калі
    жылы ўсе
                рвуцца,
сэрцы рвуцца
            ў кускі —
верш наш
            ўзрывамі —
            гучан —
віру бурнага
    ўскіп.

Не вярнулісь назад!

Гэта-ж не!
            Не вярнулісь назад!
Хоць спаткалі нас злосныя сыкі.
Горда вуліц каменьне таптала лаза,
бо за намі —
            Ён
              — Волат Вялікі!

Не вярнулісь назад!
                Свой рабінавы хмель
разсыпаючы між камяніцы.
І буяны наш подых сялянскіх асель
рве ляды, зледзянелай сталіцы.

Не вярнулісь назад, —
                бо мы шум веснавы!
А вясну — хто-ж здалее ўстрымаці?
Чуеш!
        — Небам ідуць журавы
— — — — — — — — — —
А зямлёй —
        гучны марш
                граюць лапці.

*
*   *

Жмені дзён — буйных калосьсяў
люты час ў вір кідаў сьцяўшы,
кроўю неба сплыла просінь,
кроўю па дарозе ўпаўшых.

Люты час дзён сьцятых жмені
віхроў кідаў — гончай зграі.
...Жабравалі на каленях,
ганьбы гымн сваей пяялі...

Йшлі другія, горда—стала
пад скрып перакладзін... сталі...
Грудзі ранячы аб скалы —
сонца,
сонца
здабывалі.

Песьні Палесься

Штораз мацней прыпякае вясновае сонца. Закурыліся туманамі бязьмежныя пінскія балоты. Высыпала на вуліцу шэрай палескай вёскі дзявочая моладзь вясну спатыкаць. Юра—Ключніка сырой зямліцы славіць.

Грыміць над вёскаю радасная песьня:

Юр-юравая, Юр-юравая
дочкі кліча:
падай доню, падай доню
ключы,
замкі адамкнуці,
адамкнуці,
сыру зямліцу
выпусьціці;
выпусьціці жыто,
пшаніцу, —
жыто, пшаніцу,
ўсяку пашныцу.

«Жытко, пшаніцу, усяку пашныцу» — утораць вясковай малітве рэхам гінучыя ў сіняй далячыні балотныя разлогі.

Песьціць сонца змучаныя, рана пастарэлыя твары вясковых маладзіц. Горкае жыцьцё, безпрасьветнае.

І плача песьня аб долі жаночай:

Пайду я гарою, даліною,
чы не найду я вербанькі з каліною.
Ой стану я да каліну ламаці,
ой стануць мяне сьлёзанькі абліваці.
Выламлю я найвышэйшу квітку,
да занесу бацюхну пуд пувітку.
Муй бацюхно вэлікі банкіт мае,
ходзіць по дворы дай мене ўспамінае:
—дзе ты, дзіця, чы коніка не маеш,
чы дарогі не знаеш.
шо ў мяне у гостыні не буваеш.
—Я бацюхно і коніка маю і дарогу знаю,
но за ліхім мужам у гостыні не буваю.
Ліхого мужа не збуці, не продаці
да трэба з ім свуй век коротаці.

А там як-бы ў адказ палілася мужчынская скарга:

Волы маі палавыя,
чаму вы не гарэце,
годы-ж маі маладыя —
як-жа вы марненько ідзеце.

Волы маі палавыя,
як-жа вы прыгораліса,
годы-ж маі маладыя —
як-жа вы поцералыса.

Знае дзяўчына, знае: хутка пройдзе каханьне, застануцца шэрыя будні, з дакорамі сьвякрові, з нараканьнямі на бедную нявестку, што пасагу вялікага ня мае.

Пяе любімаму:

— Ты хлопчо, я цебе здаўнюў знаю,
ты мене любіш, я тавару не маю.
Як ты возьмеш мене у сваю хату,
то будзеш товаром даганяці.
— Не буйса дэўча, не буйса нічо',
не будзе табе дагону ні од кого;
не дажэнеш ты, то дажэне твая маці,
як будуць людзі ў поле товар гнаці

А молдасьць бярэ сваё. Буяніць кроў вясновае сонца. Сьмеху хочацца і радасьці. Загойкае буйная, хмельная песьня:

Ой ішоў я чэрэз тры гароды,
не зрабіў-жа я нікому шкоды.
Ізмок, як воўк, чэрэз улоньку йдучы,
ускіс, як ліс, пуд оkенaчкам ждучы:—
— очыні, дзеўчынонька, стайню,
я сваі конікі постаўлю.
— Ішчы-ж я стайні не робіла,
каб козаку коні становіла.
— Одчыні, дзіўчынонька, сені,
бо ўжэ-ж мене комарыкі з'елі.
— Нехай цебе хоч сабакі з'едзяць
абы коло мене хорошэйшыя седзяць.
— Добра было дзеўчынонька подаруночкі браці,
а цепер не хочэш мене кохаці.
— Немнуго подаруночкоў я брала,
о'но сем пар чэрэвічок стоптала,
а осьмая лежыць у скрыні
да нехай згорыць твоя маці з імі.
Подай матко от скрыні ключы,
то я кіну козачэньку
подаруночкі ў вучы.

Звоняць. Зьвіняць бразгуны, шалястуны на заквечаных конях. Выбівае рытм вясёлы бубен.

Вясельле.

Не одчыняйце дверыны,
не выпускайце зьверыны
Тры дні коні гонілі,
покуль зьверыну зловілі —

заводзіць вясельны хор, спатыкаючы маладога.

Мы думалі сваты багаты —
ажно вуны гарбаты,
а на горбі верба, а на вербі сова —
лапамі перэбірае, свахам вочы выдзірае —

іронізуе хор у песьні з прыехаўшых.

Наша молодая — як ластоўка,
а ваш молоды — як заслонка;
наша молодая — як ясны дзень,
а ваш молоды — як горэлы пень, —

дразьніцца, насьмяхаецца з гасьцей дружына маладой.

Але не астаюцца ў даўгу і госьці:

У полі дубочок разьлегаецца,
богатыр дачкою набіваецца.
Хлопчыкі брацьця да бярыце дочку-багатырочку,
да дарую брацьця — да кубелец плацьця
і пару кашок і клочча мяшок.

Але ведаюць — не абараніцца ім ад дружыны маладой нявесткі. Лепш далікатна ў песьні зьмірыцца:

Ой будзеш нам, будзе, што мы спазьніліся,
ой мы адмовімся: убіралі мы старасту,
ды у кунныя шубы, то ў сівыя сьвіткі,
то у лісовы шапкі...

Скончыліся перараканьні дзьвёх вясельных дружын.

І гукнула сумесная песьня:

Гуляй рыба-шчука па ціхаму Дунаю,
як пуйдзеш ў быстры рэкі — позабудзеш гуляці,
там воды прыбульшае — табе рыба погуршае.
Гуляй дзеўка у сваго бацька,
як пуйдзеш до чужого, прызабудзеш гуляці:
там дзела побульшае, табе дзеўка погуршае;
там земля крэменістая, там сем'я наровістая.

Звоніць п'яна вясёлы бубен. Плача надырліва скрыпка.

А там і лета палючае надышло. Зашугацяць купальскаю начою на курганох агні, праваджаючыя ў далёкую дарогу нарадзіўшаеся вясною жыцьцядайнае Сонца-Дажбога:

Ой на Яна нучка невелічка,
дай не выспаласа дзівочка
— гой Купала! Купала!

Плывуць вадою варажобныя агні вяночкаў. Пакацілася з гары аблітае смалой і запаленае палаючае кола—сонечны знак. Канчаецца пара радасьці — пара сонечнай ласкі. Настаюць цяжкія дні летняй гароты. А там і восень хмурная, і лютая зіма.

Заціхае патроху расьпяваная паляшуцкая вёска.

ЯЗЭП ПУШЧА

Лісты да сабакі*)

I

Жыву цяпер я ў шумнае сталіцы,
далёка ад цябе, мой любы дружа.
Ляжыць акраец хлеба на стальніцы,
а ў збане на акне Юнацтва ружа.

Вятры павеюць хутка золкай сьцюжай,
і ліст крывавы свой яна уроніць.
Праходзіцьме натоўп з душой няўклюжай
і ў гразь утопча, апусьціўшы скроні.

І толькі я адзін, паэт бяздомны,
над ім сьхіляюся і акраплю сьлязьмі.
Тады забросьняюць душы затоны,
калі ў грудзях мой дух зусім мне займе.

А покуль б'е жывой вады крыніца
і хваля творчая гарачым пульсам,
нашто-ж мне падхалімам быць, крывіцца
і ў хмары ўрэзвацца чырвоным буслам?

Лепш вольным птахам рэзаць шыр нябёсаў,
і супроць ветру размахнуць крылямі.
Хто хоча — кпіце над пясьнярскім лёсам,
і бэсьце, — лайце у гандлярскай краме.

Трывожнасьць рытму песьня агартае, —
нязнаны востры боль у адчуваньнях.
Мне лепей быць звычайным-бы ратаем,
чым грэх з сябе змываць ў атрутнай ваньне.

Даруй, што я пішу табе аб гэтым, —
тваё нутро гатоў яшчэ рашчуліць.
Вартуй, вартуй лепш хату да рассвету,
вуглоў каб не разнесьлі людзі вуліц.

---

*) Язэп Пушча—перадавы таленавіты лірык Савецкай Беларусі. Зьліквідаваны маскоўска-камуністычнымі ўладамі за „нацдэмаўшчыну" яшчэ ў пэрыядзе 1929—30 гадоў.

Перадрукоўваем характэрны для ідэовага аблічча паэта, а так-жа для савецкіх адносінаў адзін з твораў Пушчы — „Лісты да сабакі" („Узвышша" № 5, 1927 г.), — за які аўтар быў востра крытыкаваны і які, як і іншыя, прычыніўся да аканчальнай ліквідацыі паэта. Рэд.

Я ведаю — цяпер у вас там восень,
і ночы чорныя жуду калышуць.
Вятры лісты ажоўклыя разносяць
і намятаюць гурбамі ў зацішак.

І ты адзін правёў у ноч такую,
правёў мяне ў далёкую дарогу.
Гадзіну гэту кожды год сьвяткую
і слухаю, ці ў дзьверы хто ня дрогне.

Ніхто, ніхто! Зацяты ланцугамі...
Хтось руку заламаў у далях сініх.
Вартуй, мой дружа, родны ганак, —
пішу аб гэтым я табе з Расіі.

II

Успомніў восень я пятнаццатага году,
і у ваччу-ж зьмяёю ўзьбіўся чорны шлях.
Ніводзін дзень ня ведаў ласкавай пагоды, —
за навальніцай навальніца сьмерці йшла.

У гэту восень стаў народ наш сіратою, —
ўздыхнулі цяжка хвалі віленскіх вазёр.
Ў капліцы ўдзень жахлівы брат сканаў з сястрою,
у сьлёзна-золкім небе згасла радасьць зор.

Ніхто з людзей ня мог адчуць наш боль трагічны;
была страшная зяб, — рыпелі косьці дрэў,
карэньні іхніх ног былі ў крыві крынічнай.
Выгнаньня дзень, бы злодзей, краўся па дварэ.

І ты стаў бежанцам у гэты дзень закляты, —
пайшоў па шчасьце у чужацкую зямлю.
Ты выць пачаў пад хатай і пад крыжам
і вочы сьлёзныя закатываць ў імглу.

Ты позьняй восеньню ў палёх глухіх брадзяжыў, —
знайсьці прыстанішча сабе ніяк ня мог.
Імгліліся жудою хмары сыпкай сажы,
а ты пад імі выў і грыз балотны мох.

І ты, і гаспадар твой сталі жабракамі;
калі-ж вас людзі праганялі зпад вакна,
тады чало сьціскаў ты лапамі, рукамі
і цернь вырываў з пакутнага вянка.

Ішлі тады, міналі дні падзей суровых,
вяртацца сталі ўсе ў асіроцелы дом.
Зьмянілі шум даўнейшы свой, лясы, дубровы,
і поле зарасло бадыльнікам кругом.

Ад мяса і крыві набухлі жылы глебы;
да іх вярнуцца ты ня змог, ня здолеў больш.
Твой гаспадар цябе зьмяніў на бохан хлеба,
па целе па тваім тады прабегла дрож.

Пайшоў ты ад сваіх, галоў на дол схіліўшы,
да бацькі да майго, дзе я й цябе сустрэў.
Падумаў ты: — у сьвеце гэтым многа лішніх,
і смагла сьлёзы піў, што падалі са стрэх.

Былі ці ня былі ў нас родныя натуры,
а толькі мы адзін другога сталі разумець.
Замоўклі рэвалюцыі вялікай штурмы,
атрэсьлі клёны ў сінь лістоў ажоўклых медзь.

І я пайшоў у горад за нязнанай славай,
а ты астаўся там-жа пад страхой старой.
Ліста мне ад цябе ні разу ня прыслалі,
хоць ты й пісаў яго вячэрняю зарой.

Туга і боль душу пабілі мне на раны,
і я пачаў успамінаць цябе часьцей,
пачаў выходзіць на шлях дарогі раньнем
і запрашаць к сабе няведамых гасьцей.

Успамінаў аб табе ўсё-ж нікому не рассеяць:
І знаю я, калі вярнуся ў родны дом,
адно спазнаеш ты, спазнаў як Одысэя:
прыміж ты ад мяне гарачы мой паклон.

III

Ці я ў тэатры, ў рэстаране п'яным,
дзе радасьць расьпіваюць пад джас-банд:
усюды зрок вачэй блакітных вяне,
і ўсюды бачу я жалобны бант.

Няхай сабе я сёньня страшна хворы,
ня трэба ўсё-ж рэцэптаў для душы.
Сталецьцямі гарадзь і сьвецяць зоры,
і іх вятрэ ня ў сілах затушыць.

Няхай, няхай гавораць так і гэтак,
а пішу табе ўжо трэйці ліст,
няхай сабе аблаюць і ў газэтах,
мо' ўспомніць часам хто калісьць.

Мой дружа, ці-ж у гэтым рытме песень
і смутак сёньняшняй красы?
Калі паэт галоў на грудзі зьвесіць,
няўжо краіне ён тады ня сын?

Мне часта зябка й холадна бывае,
і ўсё-ж ніхто ні разу не сагрэў,
не цалаваў-жа зраднымі губамі
ніколі я лістоў, апаўшых з дрэў.

Стаю вось перад зімнім тут палацам
і ўвесь, ня ведаю й чаго, дрыжу,
і сам ня ведаю, чаго так плачу...
Хто там? Прыдзі хуччэй-крыжуй!

Канец хай ўсім маім цярпеньням;
няхай лісты разьвеяцца з асін,
з чала краіны вырву ўсе-ж я церні,
каб болю іх ня ведаў болей сын.

Няўжо мне ранаў песьня не загоіць,
што гэткі трывожны б'ецца пульс?
Паэт, які ня ведае агоній,
ня здолее уславіць Беларусь!

Ой, гэта слова, слова дарагое!..
Ах, дружа мой, заўсёды рытм сабе!
Я-ж напісаць хацеў зусім другое,
хацеў у госьці запрасіць цябе.

Адно вось толькі думы непакояць:
ці ўдасца ўсё-ж даехаць да мяне?
Ну, скажам, адвязуць к чыгунцы коні,
аж бліснуць зоры ў полі спад саней.

А там білет, і ты ў вагоне спальным;
ты сьнедаць зможаш ў рэстаран пайсьці,
у ім зімою зелянеюць пальмы,
і думаеш — зімы няма ў жыцьці.

А на вакзал, на сьветлую плятформу
прыду я сам, прыду цябе сустрэць.
Адзін другога горача прыгорнем, —
даўно, даўно ня меў такіх я стрэч.

Ня ўсьпееш з дому перадаць вітаньня,
шчэ вочы будуць ў радаснай жальбе,
і тут-жа раптам горыч разьвітаньня,
ў сталіцы не дазволяць жыць табе.

Адзет ня будзеш ты ў парадны кіцель,
ня будзеш мець заслугі-медаля,
зьбягуцца і абступяць цябе гіцлі,
і будзе шмат іх: дзе ні стань, ні глянь.

Жыві, жыві, знаць дома лепей;
услухвайся ў таёмны шум і шэпт,
чужыя людзі ходзяць каля склепу,
пільнуй! Цябе цалуе твой Язэп.

Ліст ад сабакі

Добры мой паэт, прабач,
што доўга ня было ліста.
Твой сьлёзна-горкі плач
хацеў я днямі залістаць.
Усё хацеў, каб як астыць
пад ветра-сьвіст з прысад.
Атрымаць лісты, лісты...
ніяк ня здолеў адрэсат.
Знаць ня знаю — жыў ён, не,
ці блудзіць з хэўрай валацуг?
Толькі крук тырчыць ў сьцяне,
чаплялі за які ланцуг.
Дом зусім, зусім раскрыт,
цяпер я ў ім вартую сінь.
Бачыш, стыль які і рытм,
заместа бацькі піша сын.
Добры мой, лісты твае
калі мне прачытаў твой брат,
гойсаць стаў я па траве
і пасабачаму стаў рад.
Выць пачаў на млечны шлях,
каб ён яшчэ сьвяціў ярчэй,
пасьля лёг каля шула
і сьлёзы хлынулі з вачэй.
— Дзе мой бацька, дзе радня?
Жыву вось тут, жыву адзін,
я штоночы і штодня
ня маю радасных гадзін.
Добры мой, пішы яшчэ,
пішы навіны мне свае.
З песьняй жыць куды лягчэй,
душа ня хоча з ёй сівець.
Часта я гляджу у даль,
ці вобраз твой ня ўбачу там?
Разьвявае лёгкі шаль
ў даліне сонечнай туман.
Не пайду я з-пад вакна, —
твой чую крок ў людзкой хацьбе.
Увесну, як прыедзеш к нам,
я першы абніму цябе.
Выйду, стрэчу ля варот, —
такі, такі ўжо ў нас закон.
Будзе мой сьмяяцца рот,
і цалавацца буду языком.
Знаю, знаю, ты жывы,
цябе ніхто не запражэ...
Будзь-жа, будзь здароў, жыві;
цябе цалуе моцна Жэк.

A. Н.

Абдзіраловіч і Барыка

(Літаратурная паралель)

У той час, калі ў Расеі валіўся стары лад і пачыналася будаваньне новага жыцьця, — для людзей, што ўзрасьлі ў атмасфэры старога ладу і псыхікай сваей былі з ім крэпка зьвязаны, ня лёгка было «самавызначыцца» і знайсьці належны шлях паступаньня.

Шмат было розных прычын дзеля гэтага, перашкаджаўшых «самавызначыцца» нават тым, хто быў у сваей сьвядомасьці ворагам старога ладу. Рэвалюцыя — гэта быў «скок у няведамае», і гэтага няведамага баяліся нават шчырыя і гарачыя барацьбіты за волю, папросту ня верыўшыя ў здольнасьць зрэвалюцыянаваных масаў да працы канструктыўнай. Хто ведае, ці не адыгралі тутака ролі і тыя думкі-разважаньні, якія гэтак ярка выказаў у маленечкім, чатырохрадковым вершыку сваім Адам Міцкевіч, ды якія на пачатку сацыяльнае рэвалюцыі ў Расеі апраўдаліся гэтак трагічна прыкладам у адносінах да Шінгарева і Кокошкіна, прамотараў лютавае рэвалюцыі:

> Ręce, za lud walczące, sam lud poobcina;
> Imion, miłych ludowi, lud — pozapomina...
> Wszystko przejdzie! Po huku, po szumie, po trudzie
> Wezmą dziedzictwo cisi, ciemni, mali ludzie.

Бязумоўна, у гэтым хістаньні, у гэтай баязьні «скокнуць у няведамае» былі і іншыя прычыны. «A la guerre comme à la guerre!» — падчас змаганьня сілай патрэбны людзі, гатовыя на ўсё, пазбаўленыя ўсякіх «скрупулаў», далёкія ад гуманітарызму, каторы ў рашаючы мамэнт можа паўстрымаць руку ад жорсткага, але неабходнага ўдару. Ня кожны пачуваўся здольным да гэтага. Апрача гэтага падчас расейскае рэвалюцыі сярод староньнікаў перавароту бачым падзел: адны з учасьнікаў рэвалюцыі, ськінуўшы царскую ўладу, каб не дапусьціць да далейшага праліцьця крыві, хацелі захаваць у нязьменным стане ўвесь стары сацыяльны лад, хацелі адбудовываць паруханае вайной жыцьцё вялізарнае краіны так, каб і капіталіст, і абшарнік аднавілі свае «варштаты працы» на падставе даўнейшага вызыску працоўных масаў, на падставе паняволеньня сьвету працы — капіталам. Гэты стары сацыяльны лад быў такі прывычны, шляхі да змаганьня за палепшаньне быту работніка і селяніна ў рамках гэтага ладу былі гэтак добра распрацаваны, што тварцы лютавае рэвалюцыі гатовы былі ўсімі спосабамі бараніць гэты лад ад атэнтатаў на яго, робленых у імя «няведамага заўтра»... У магчымасьць будаваньня новага сацыянага ладу яны ня верылі!

Паверыла ў гэту магчымасьць толькі малая жменя фанатыкаў ідэі сацыяльнае рэвалюцыі. Але, ня гледзячы на сваю малую лічэбнасьць і беднасьць інтэлектуальнымі сіламі, здольнымі да будаваньня новага дзяржаўнага і сацыяльнага ладу, іменна гэтая малая жменя людзей з Ленінам і Троцкім на чале перамагла гэткую магутную, на пагляд, расейскую дэмакрацыю, якая не адважылася ўзыйсьці на шлях сацыяльнае рэвалюцыі. Перамагла, бо за ёй пайшлі народныя масы, ня меўшыя ніякіх «гуманітарных скрупулаў» інтэлігенцыі, не баяўшыяся «скоку ў няведамае». Сталася тое, чаго ніхто не спадзяваўся. І калі нават сягоньня — праз дваццаць адзін год пасьля таго, як у Расеі пачалося будаваньне новага сацыяльнага ладу, — калі нават і цяпер дэмакратычная інтэлігенцыя расейская верыць у магчымасьць хуткага павароту старога рэжыму, — дык можна сабе лёгка прадставіць, як тая-ж інтэлігенцыя мусіла глядзець на ход выпадкаў беспасярэдня пасьля кастрычнікавага перавароту, як ей трудна было пагадзіцца з фактам такое глыбокае, такое ўсебаковае перабудовы старога грамадзкага жыцьця.

Тое-ж, што перажывала расейская дэмакратычная інтэлігенцыя ў Расеі пасьля перамогі камуністаў, перажывалі — mutatis mutandis — прадстаўнікі сацыяльнага радыкалізму ў Польшчы, калі — дзякуючы баечнай для Палякоў міжнароднай кон'юнктуры, пры якой Польшч атрымала дзяржаўную незалежнасьць, — перад грамадзянствам узьнялося пытаньне: якую-ж Польшчу трэба будаваць? І ў Польшчы толькі малая жменя людзей лятуцела аб новай Польшчы — Польшчы сялян і работнікаў, як аб краіне сацыяльнае справядлівасьці, краіне, у якой ня будзе паняволеньня працы капіталам. Але тут на шлях адбудовы Польшчы капіталістычнае пайшлі нават у большасьці сваей нацыяналістычна і клерыкальна настроеныя сялянскія ды ў значнай меры й работніцкія масы. Чароўны зык словаў: «незалежная Польшча» засланіў сабой пытаньне аб унутраным зьмесьце адбудаванае дзяржавы, аб сацыяльным ладзе ў ёй. Нацыянальная ідэя засланіла сабой сацыяльную. А гэта вырашыла пытаньне аб будучыні Польшчы на доўгія гады... Польскі народ збудаваў для сябе свой нацыянальны дом, поўнасьцю захаваўшы капіталістычны лад і рашуча супрацівіўшыся рэвалюцыі сацыяльнай. І нават польскія сацыялісты, меўшыя ў першы мамэнт уладу ў сваіх руках (урад Морачэвскага!), не адважыліся пачаць адбудовы сваей бацькаўшчыны на новых сацыяльных падставах.

Зусім натуральна, што сярод радыкальна настроеных элемэнтаў у Польшчы мусіла адбыцца пэўная ідэолёгічная ломка, што ня кожнага аднолькава можа зачараваць адна толькі дзяржаўная незалежнасьць... Як у пасьля-кастрычнікавай Расеі большасьць дэмакратычнае інтэлігенцыі не магла пайсьці нага ў нагу з тварцамі новага — сацыялістычнага ла-

ду, так у Польшчы, адроджанае дзяржаўна, радыкальная меншасьць не магла знайсьці для сябе месца для актыўнае творчае працы ў рамках дзяржаўнага будаўніцтва на старых сацыяльных падставах. І шмат хто пэўне-ж вельмі балюча перажываў немагчымасьць датарнавацца да створаных тамака варункаў жыцьця, шмат хто ня мог «самавызначыцца», знайсьці адпавядаючы ягонай ідэолёгіі жыцьцёвы шлях.

Гэтую сытуацыю, якую — разам з расейскай і польскай радыкальнай дэмакрацыяй — перажывала й перажывае такжа дэмакрацыя беларуская, адтварылі ў мастацкіх абразох — у форме повесьці — два пісьменьнікі: беларускі Гарэцкі ў повесьці *„Дзьве душы“* і полькі Жэромскі ў повесьці *„Przedwiośnie“*. Гарэцкі пісаў сваю повесьць у Вільні ў 1919—20 г. г.; Жэромскі — недзе ў Польшчы ў 1924 годзе. Беспасярэдняга ўзаемнага ўплыву тут быць не магло. Але тэма папросту «вісела ў паветры» і, відаць, лішне балюча ўражала душы абодвых пісьменьнікаў, каб яны маглі не зарэагаваць на яе. І яны далі творы, якія шмат у чым вельмі падобны да сябе, якія разьвязваюць тую-ж праблему, хоць і ў розным асяродзьдзі, аналёгічна.

Пачнём разгляд абодвых твораў з повесьці Гарэцкага «Дзьве душы». «Двудушнасьць» галоўнага героя Гарэцкага, прапаршчыка Абдзіраловіча, гэта ёсьць той духовы разлад, які паўстаў у яго ў сувязі з сацыяльнай рэвалюцыяй у Расеі. Абдзіраловіч быў да выбуху сусьветнае вайны студэнтам і працаваў у сацыялістычных арганізацыях. Дык рэч зусім зразумелая, што «Керoccшчына» не магла яго здаволіць: яна-ж якраз ахоўвала стары сацыяльны лад, яна — так трагічна для сябе — імкнулася да непапулярнае далейшае вайны — «да пабеднага канца», колькі-б крыві народнае гэтая вайна ні вымагала. Незадоўга да бальшавіцкага перавароту Абдзіраловіч едзе лячыцца ад сваей раны на Каўказ і тутака пападае ў асяродзьдзе бежанцаў-Беларусаў. Абмаскоўлены беларускі магнат, гвардзейскі афіцэр, князь Гальшанскі, — відаць прадчуваючы магчымасьць сацыяльнага перавароту, — распачынае сярод гэтых бежанцаў акцыю, маючы на мэце прынамся ў Беларусі, дзе ляжаць ягоныя маёнткі, не дапусьціць да вавастрэньня клясавае барацьбы. Гальшанскі склікае мітынг бежанцаў-Беларусаў і ў бліскучай прамове, спрытна жонглюючы нацыянальнымі лёзунгамі, стараецца пераканаць сваіх слухачоў, што ў Беларусаў няма сацыяльнае барацьбы, што ўсіх — і абшарнікаў, якія раптам сталіся «тоже бѣлоруссами», і сялян і работнікаў — мусіць аб'яднаць пачуцьцё прыналежнасьці да аднае беларускае нацыі. Нацыянальны салідарызм (хоць у даным выпадку ён быў ілжывы, бо Гальшанскі па духу — маскаль!) павінен перамагчы ідэю сацыяльнае барацьбы і сацыяльнае рэвалюцыі.

Ілжывасьць гэтае канцэпцыі гэткая відочная, што Абдзі-

раловіч дае вострую рэпліку князю і зусім шчыра выказываецца на карысьць сацыяльнае рэвалюцыі.

Аднак, калі камуністы пасьля гэтае прамовы зварачаюцца да Абдзіраловіча, як да свайго аднадумца, і прапануюць супрацоўніцтва з імі, Абдзіраловіч б'ецць адбой: ён кажа, што, як афіцэр, верны сваім абавязкам, ён будзе бараніць існуючы цяпер законны лад...

Калі Абдзіраловіч, пасьля сваей сэрцовай драмы, пакідае Каўказ і пападае ў Маскву, там якраз ідуць баі паміж «белымі» і «чырвонымі». Сымпатыі яго ізноў як быццам на старане чырвоных, але ён ніяк ня можа «самавызначыцца» на іх карысьць. Ён усьцяж хістаецца. Шмат што злучае яго і з «белымі». Але і да іх ён ня йдзе. Жорсткасьці адных і другіх падчас аружнага змаганьня адпіхаюць Абдзіраловіча і ад адных і ад другіх.

Абдзіраловіч едзе на правінцыю. Адведывае свайго старога прыяцеля — народнага настаўніка, беларускага адраджэнца. Спатыкаецца з сваей старой сымпатыяй, вучыцелькай Ірай Саковічанкай, гэтак сама чыннай працаўніцай на беларускай ніве. Бачыць і іншых сьведамых Беларусаў, знаёміцца з іх ідэаламі, імкненьнямі, работай. На адзін мамэнт здаецца, што вось-вось ён урэшце «самавызначыцца», як беларускі нацыяналіст. Але і да гэтага не даходзіць. Абдзіраловіч да нікога ня можа прыстаць, хоць у крытычныя мамэнты робіць услугі і «белым», і «чырвоным», і беларускім адраджэнцам. Выбіты ходам выпадкаў з прывычнае каляіны, герой Гарэцкага ня можа вярнуць сабе ўтрачанае духовае раўнавагі і пайсьці рашуча й кансэквэнтна па тым ці іншым шляху. На гэта ён — лішне слабы.

Такіх хістаючыхся, расхлябаных духова інтэлігентаў было шмат падчас перастройкі сацыяльнага ладу і ў Расеі і ў Беларусі. І зьявішча гэтае — настолькі натуральнае, настолькі аб'ектыўна зразумелае, што няма патрэбы шукаць прычыны яго ў нейкіх асаблівых, чыста індывідуальных тайніках душы Абдзіраловіча. Гарэцкі зрабіў бясспрэчна абмылку, шукаючы вытлумачэньня факту хістлявасьці свайго героя ў тым, што яшчэ ў люльцы ён, сын сялянкі-мамкі, быў заменены на панскае дзіця. Гарэцкі сугеруе думку, што «двудушнасьць» Абдзіраловіча, а мо' лепш — «трохдушнасьць» яго!— гэта вынік узгадаваньня сялянскага дзіцяці ў чужой для яго сацыяльна панскай атмасфэры. Але гэтага ён нічым не даказывае. Бо-ж і тая акалічнасьць, што Абдзіраловіч, быўшы студэнтам, разыйшоўся з сваім псэўдо-бацькам на грунце разьбежнасьці сацыяльных паглядаў (стары Абдзіраловіч — абшарнік, цалком прасякнены сьветапаглядам сваей сфэры), — нічога пе даказывае: у гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Расеі выпадкі ўчасьця ў рэвалюцыйнай працы сыноў арыстакратычных сямей не такія ўжо рэдкія. Дык лепш бы-

ло-б, калі-б Гарэцкі ня сіліўся даказаць, што «двудушнасьць» Абдзіраловіча ёсьць вынік «прышчэпкі» мужыцкага дзічка да панскага дрэва: бачаныя Абдзіраловічам падзеі былі такога роду, што іх хапала, каб разьбіць слабую ад прыроды духовую арганізацыю Абдзіраловіча.

Жэромскі пайшоў больш натуральным шляхам і пабудаваў свой твор іменна на тым, што Гарэцкаму здавалася недастатачным: на ўплыве на маладога Барыку перажыванага мамэнту, тых страшэнных часта падзеяў, сьведкай якіх давялося яму быць.

Маладога Барыку сацыяльная рэвалюцыя захапіла на Каўказе — тым самым Каўказе, на якім бачылі мы першую спробу актывізацыі Абдзіраловіча. Рэвалюцыя робіць на маладога Бабыку вялізарнае ўражаньне. Ён гэтак захоплены ёю, гэтак горача імкнецца прылажыць і сваю руку да будаваньня новага сацыяльнага ладу, што аддае рэвалюцыйнай уладзе захаваны ў склепе Барыкай-бацькам скарб: 200 тысяч рублёў золатам. Ён прыносіць у ахвяру рэвалюцыі—ці правільней: свайму наіўнаму пагляду на рэвалюцыю—сваю родную матку, якую шчыра кахае, але ня можа зразумець. Але яго балюча б'юць па нэрвах бачаныя страшэнствы рэвалюцыйнае барацьбы. А йшчэ больш — страшная армянска-татарская разьня, у якой пагіблі на ягоных вачох тысячы ні ў чым невінаватых Армянаў. Гэта выклікае ў яго варожыя адносіны да нацыяналізму, падгатаўляючы такія-ж адносіны і да нацыяналізму польскага, з каторым малады Барыка спаткаецца пазьней у незалежнай ужо Польшчы.

Калі Барыка, пабуджаны да гэтага паміраючым бацькам і расказанай яму апошнім фантазіяй аб «шкляных дамох», едзе ў Польшчу, у яго ў душы шмат засьцярог у адносінах да адбудаванае на старых капіталістычных падставах бацькаўшчыны. «Шкляных дамоў» для работнікаў і сялян ён не знайшоў у Польшчы. Але польскія працоўныя масы гэтак заварожаны фактам дзяржаўнае незалежнасьці Польшчы, што, калі на Варшаву наступаюць бальшавікі, каб завясьці ў Польшчы новы сацыяльны лад, гэтыя масы хапаюцца за аружжа і з энтузьязмам ідуць выганяць чужынцаў-наезднікаў. Нацыянальная ідэя, ідэя нацыянальнага салідарызму аказваецца ў той мамэнт дужэйшай за ідэю сацыяльнае рэвалюцыі. Агульнаму настрою паддаецца і Барыка, які таксама йдзе ў армію і памагае перамагчы бальшавікоў. Але беспасярэдня пасьля ваеннае перамогі Барыка пападае ў багаты панскі двор, дзе ў працягу некалькіх месяцаў жыве жыцьцём абшарніцтва — у дастатках і раскошы, знаёміцца з няведамым яму дагэтуль буржуазным сьветам, пазнае яго мараль, ілжывасьць, крывадушнасьць... Назоў гэтага двара — «Навлоць» — стаецца для яго імем агульным, азначаючым нешта агіднае. І здавалася, што вось-вось Барыка пойдзе на шлях камуністычнае пра-

цы, на які яго заклікае ягоны таварыш Люлек — фанатык ідэі камунізму. Люлек вельмі добра ацэнівае Барыку, як чалавека хістлявага, псыхіку якога абцяжаюць „naleciałości burżuazyjne". Дык стараецца сыстэматычна на ўсе способы хаяць Польшчу і пануючы ў ёй буржуазны лад, часта нават перацягваючы струну і выклікаючы неспадзявана рэзкія рэплікі ў Барыкі. Калі-ж урэшце Люлек, пэўны ў сваей перамозе над Барыкай, вядзе яго на патайны камуністычны сход, на якім партыйныя прамоўцы пачалі востра бэсьціць адроджаную Польшчу, — падсьведамае нацыянальнае пачуцьцё гэтак збунтавалася ў Барыкі, што ён, — даўшы вострую, хоць слаба абаснаваную рэпліку камуністычным прамоўцам, — пакідае іх сход.

„Zaprzeczał jednym, zaprzeczał drugim, a swojej własnej drogi nie miał pod stopami", — кажа аб ім Жэромскі. — „Odzywa się we mnie — паўтарае за Плятонам Барыка — głos jakiś wewnętrzny, który, ilekroć się odzywa, odwodzi mię zawsze od tego, cokolwiek w danej chwili zamierzam czynić, sam jednak nie pobudza mię do niczego".

Аднак, аргумэнты, якія дае рэальнае жыцьцё Польшчы, выклікалі глыбокі фэрмэнт у душы «двудушнага» Барыкі. І вось — пасьля доўгіх хістаньняў, якіх Жэромскі ня мог ці мо' не хацеў раскрыць перад чытачамі, Барыка ўрэшце «самавызначаецца»: на апошняй бачыне повесьці Жэромскага мы бачым яго ў першым радзе з'арганізаванае камуністамі дэманстрацыі, якая йдзе пад Бэльвэдэр — насупраць наведзеных на яе салдацкіх вінтовак...

Барыка, пасьля доўгага хістаньня, — такога-ж, якое перажываў і Абдзіраловіч, — урэшце выбраў свой шлях, на якім мо' й загінуў: хаця Жэромскі накінуў заслону на тое, што мусіла стацца пад Бэльвэдэрам пры сустрэчы дэманстрантаў з войскам, лёгіка прымушае думаць, што першыя кулі польскіх жаўнераў ня мінулі Барыкі... Герой Гарэцкага да дакога канца не дайшоў: на гэта патрэбна была тая чыста стыхійная сіла, якую меў Барыка ды якое не хапала Абдзіраловічу.

Усё-ж такі між Б-ай і Аб-ам існуе глыбокая аналёгія. Яна вынікае з супольнае асноўнае ідэі повесьці Гарэцкага і повесьці Жэромскага. Але цікаўна, што і ў фактуры «Дзьвюх душ» і «Przedwiośnia» кідаецца ў вочы цэлы рад аналёгічных мамэнтаў, тым больш дзіўных, што, як сказана на пачатку, беспасярэдняга ўзаемнага ўплыву у аўтараў гэтых повесьцяў быць не магло. Затрымаемся на гэтых мамэнтах.

Перад усім, як ужо было ўспомнена, першыя крокі абодва героі ў разгляданы пэрыёд свайго жыцьця робяць на Каўказе. Чаму? Што было прычынай такое зьбежнасьці, такое коінцыдэнцыі? Здаецца, што не памылімся, калі скажам, што і Гарэцкі і Жэромскі перанесьлі акцыю на Каўказ з тэй мэ-

тай, каб апраўдаць варожасьць абодвух герояў да нацыянальнае ідэі.

Запраўды-ж: Абдзіраловіч першы раз сустракаецца з беларускай нацыянальнай праблемай на сходзе бежанцаў-Беларусаў, на якім абмаскоўлены беларускі абшарнік спэкулюе на нацыянальным пачуцьці бежанцаў дзеля выкарыстаньня яго для барацьбы з насьпяваўшым выбухам сацыяльнае рэвалюцыі. Абдзіраловіч гэта зразумеў і прыпомніў тыя балючыя для кожнага сына беларускае вёскі адносіны, якія да вайны існавалі паміж вёскай і панскім дваром. Абдзіраловіч папсаваў Гальшанскаму спэкуляцыю на нацыянальнай ідэі. Але, пазнаёміўшыся з беларускай нацыянальнай ідэяй у інтэрпрэтацыі беларускага рэнэгата і сьведамага спэкулянта на ёй, Абдзіраловіч, ясна-ж, ня мог ёю захапіцца, ня мог ані пагадзіць яе з барацьбой за сацыяльнае вызваленьне беларускіх сялянскіх масаў, ані — тым балей — ня мог паставіць гэту ідэю вышэй за ідэю сацыяльнае рэвалюцыі.

Барыка, далёкі ад жыцьця Польшчы і яе доўгалетняе барацьбы за нацыянальнасьць і дзяржаўнасьць, на тым-жа Каўказе знаёміцца з нацыянальным пытаньнем у яго найбольш жахлівай і агіднай пастаці: у пастаці дзікога шовінізму, страшнае ненавісьці людзей аднае нацыі да людзей другое, якая даводзіць да забойстваў бязьвінных ахвяраў нацыяналістычнага шалу, да ўзаемнага зьніштажэньня. Барыка пераўжыў армянскую разьню ў Тыфлісе, учыненую Татарамі. І Жэромскі хіба-ж сьведама малюе гэтак памастацку бачаныя Барыкай страшэнствы, каб вытлумачыць і апраўдаць варожыя адносіны свайго героя да кожнага нацыяналізму, у тым ліку і да нацыяналізму польскага.

Другая нязвычайна яркая аналёгія ў фактуры повесьцяў Гарэцкага і Жэромскага — гэта тыпы галоўных дзеючых асобаў. Побач з парай: Абдзіраловіч — Барыка, маем тут яшчэ тры пары аналёгічных тыпаў: кн. Гальшанскі — і Барвіцкі, Аля — і Ляўра, Іра Саковічанка — і Караліна Шарлатовічанка. Прыгледзімся да іх бліжэй.

І Гальшанскі і Барвіцкі — гэта тыпы «сытых буржуяў». Іх вонкавы выгляд, іх спосаб паступаньня, іх самапэўнасьць і пачуцьцё вышэйшасьці над усімі, якое дае матар'яльнае багацьце нават вельмі бедным духова адзінкам, — усё гэта падана абыдвума аўтарамі зусім аднолькава. І аднолькава — толькі дзякуючы свайму багацьцю — Гальшанскі адбівае Алю ў Абдзіраловіча, а Барвіцкі вырывае Ляўру ў Барыкі, хоць і адна і другая шчыра любіць «таго другога». Хвароба Алі пасьля разрыву з Абдзіраловічам, апошняе спатканьне Ляўры з Барыкай у Варшаве поўнасьцю гэта пацьвярджаюць.

Між Аляй і Ляўрай ёсьць розьніца ў адным: у веку і ў дасьпеласьці. Аля — гэта красачка, якая толькі расцьвітае. Ляўра — краска расцьвіўшая, якая сваей красой заваражы-

вае Барыку таксама, як Аля заваражыла Абдзіраловіча. І адна і другая — тое найхарашэйшае, найбольш вартаснае, што вырастае ў буржуазным жыцьці: ідэя жаноцкага хараства. Але і адна і другая маюць на сваіх душах кляймо, якое фальшывая маральнасьць на іх налажыла. Гэтае кляймо і ёсьць прычынай разрыву Алі з Абдзіраловічам, Ляўры з Барыкай: і тут і там шчырая, глыбокая любоў прыносіцца ў ахвяру імкненьню да матар'яльнага дабрабыту, сытасьці, панскага жыцьця.

Трэйцяя пара аналёгічных тыпаў, мо' крыху менш да сябе падобных з увагі на жыцьцёвыя абставіны, гэта Іра і Караліна. Абедзьве — вельмі нармальныя, жыцьцярадасныя, веручыя ў магчымасьць шчасьця для іх маладыя дзяўчаты, адзначаючыяся высокім маральным роўнем і асаблівай чуткасьцяй у адносінах да свайго любага. Але варункі жыцьця вясковае настаўніцы і дачкі абшарніцкае сям'і — розныя. І ідэалы жыцьцёвыя — розныя: Іра мае ідэалы грамадзкія — нацыянальныя, дзеля якіх не захістаецца ахвяраваць і асабістае шчасьце, і сваё жыцьцё, Караліна ніякіх пазытыўных грамадзкіх ідэалаў ня мае, а яе ненавісьць да зруйнаваўшых дабрабыт яе бальшавікоў—гэта-ж ёсьць толькі нэгацыя.

Сярод жаноцкіх пэрсонажаў з маладога пакаленьня бачым у Жэромскага йшчэ трэйці, адпаведнага якому ў Гарэцкага няма. Гэта ёсьць Ванда Опочыньска, яшчэ як быццам падростак, але з перарастам перадчаснага эротызму, каторы дзіўна ўжываецца з артызмам яе, як высока ўталентаванае піяністкі. Такіх тыпаў, такога пэрвэрсыйнага вытвару сучаснае цывілізацыі Гарэцкі ў сваім грамадзянстве, пэўне-ж, ня мог бачыць. Эротызм у беларускай літаратуры наагул выяўляецца даволі слаба дый, калі выяўляецца, дык у зусім нармальных праявах — далёкі ад усякай пэрвэрсіі.

Параўнаньне гэтых твораў Гарэцкага і Жэромскага выклікае такое ўражаньне, што некаторыя літаратурныя тэмы ў пэўныя гістарычныя мамэнты запраўды-ж як быццам «вісяць у паветры». Дый яно так і мусіць быць: бо тэмы, распрацаваныя ў повесьцях «Дзьве душы» і «Przedwiośnie», гэта ёсьць найбольш істотны зьмест грамадзкага жыцьця і СССР, і БССР, і Польшчы ў часе пісаньня гэтых повесьцяў. Дык коінцыдэнцыя ў літаратурнай апрацоўцы тае самае асноўнае тэмы Гарэцкім і Жэромскім не прадстаўляе нічога дзіўнага. Яна толькі паказывае, што абодва аўтары — беларускі і польскі,—хоць талент пачынаўшага толькі тады пісаць Гарэцкага і дасьпелага ўжо зусім у 1924 г. Жэромскага трэба мерыць рознай мерай, выявілі аднолькавую чуткасьць у адносінах да перажываньняў грамадзянства і аднолькава правільна намалявалі нам абраз духовага разладу ў гэтым грамадзянстве, катораму гэтак трудна было «самавызначыцца» ў пераломны мамэнт жыцьця роднага краю.

МАКСІМ ТАНК

Абразы

(З паэмы: „Сілаш Істома“)

— „Салавей, салавей пташачка!“...
Песьня калыша пэронам
і вечарам пазелянеўшым ад шапак, шынэляў салдат.
Прайшлі захліпаючыся сьлязамі наўзрыд эшалоны
чырвонага крыжа, апырскалі фронту крывёй плякат —
маніфэст і людзкі муравейнік і шыны.
Ды зноў дакучлівая песьня, гармоніка піск у вушшу.
Чапляецца, росючы жалем, за хустку, павекі дым сіні.
Крануліся цяжка таварныя мелючы шум.
Падвеям у шчэлі вагону заносяцца зоры.
Здаецца ў паўсьне каласы атрасаюць зару.
І плямы ў вачох ад белых, чырвоных агнёў сэмафораў.
Чуе на шыі Раіна дотык дзіцячых рук.
— Далёка сама?.. З дзіцям у такую дарогу!
Засьні, да мяхоў прытулі галаву.
Вось бандаж патужу, пагляджу я малога.
Як завецца? Сілаш?.. Бяз білета ў Маскву? —
Із спагадай
салдат галавою ківае.
І сьмяецца Сілаш, з муштука яго ловячы дым.
І цяплей сына туліць Раіна:
— Нічога, сама я...
як ня сьпіць усю ноч, гаварыла-бы з ім.

— — — — — — — — — — — — — — — — — — — —

Манатонна калыша вагоны.
І трудна
не заглядзіцца хмарна ў сінеючы шлях,
забываючы жаль, перажытыя будні, —
помніш толькі адно: як любіла зямля...
Часам блісгуць імшараў лільёвыя плесьні
і цяклічын зялёных, крыніц матузы;
раньняй вохрай апырсканы
цяглы бярэзьнік,
прамільгнуць астравы пералесак, лазы,
ператканыя верасам цёплым, цьвітучым...
Бор зьвініць літым золатам пнёў.
Рэха льецца па жылах смалістых, пахучых
бурштынавым хмелям.
Сівых ваблакоў
вецер пасмы калыша на змрочных папахах.
У глыбі—цені зябрай густой

аплялі да зямлі, да чырвонага вогнішча ягад
храпаватыя вывараці,
сухастой...

— — — — — — — — — — — — — — — — — —

Газэтчыкі хрыпла, назойліва нешта крычалі:
— Вячэрні дадатак...
— нямецкі адкінуты фронт!..
А бежанцаў новая, шэрая хваля
ўсплыла, Александраўскі змыла пэрон.
— Можа вярнуцца?—
цяжэюць Раініны думы,
быццам іх дождж налівае трывогай, тугой, —
дождж, які недзе па цёплых асецях і гумнах
малоце цапамі і пахне саломай сырой;
а можа шуміць ткучы над акопамі восень,
рвучы серабраны уток
у калючай
аснове дратоў...
На завароце галосяць, брынчаць калёсы
і звоне разьбітае шкло дажджавых пузыроў.
Вышэй парасонаў
пакрыўшых жалобай галовы,
вышэй пазалочаных грэбняў
жалезнага мора стрэх,
ўздымаючы цёмную золь, над пляцам грымяць падковы
спуджаных коняй на браме і хмараў узьветраны бег.
Глядзіць недаспаўшы Сілаш на вогнішча шумнае вуліц.
Здаецца згубіўся: ні сьцежкі, ні стрэхаў знаёмых сяла...
А дом ужо блізка?..
Нехта нясе яго, туліць,
нехта знаёмы пытае:
— Сьцюдзена можа, Сілаш?..
Голас, як вечар ліпнёвы, гаючым цяплом атуляе.
У сіце вакон камяніцаў блішчыць толькі бруку вуза,
лісьце і гразь.
Бутырак сьцяна глухая
шэрым навісла масывам, а за
сеткай укоснай дажджу тускла цьвітуць ліхтары, ды
на крыжаваньні ветру
і шын,
і дратоў
рвуцца з трамваяў сінім агнём акварыды,
згараючы,
сыпяцца ў вочы,
цёмнымі іскрамі — сном.

Перад ад'ездам

Зноў шкода мне родных аселіц,
скрыпучых на полі калёс.
Туман без мяне ўжо абеліць
атаву зьвінячую, плёс.
Зара на куросаднях ціха
зьбіраецца ўжо начаваць.
А мне яшчэ хочацца крыху
на ржышчы пустым пастаяць,—
як быццам адходзячы ў горад
забыўся сказаць весялей:
каб і без мяне усе зоры
гарэлі над
вёскай маей!

21.1.39.

Думы

Плыве хвалюючыся шум,
сьцюдзёны шум па нівах чорных
і нізка
нізка
хмары дум
лятуць асеньнім шляхам зорным.

На ўзмор'е нельга адагнаць,—
за молём парусы бялеюць;
а да цябе, — і ты адна,
і над табой яны цямнеюць.

Палю агонь.
З усіх старон,
як цьма шалёная, сьляпая,
лятуць сны-думы на агонь —
і добра што яны згараюць.

18.1.39.

Пад восень

Цяпер гасьцей убачыш рэдка—
і тыя зморaныя сном.
А верасьнёвых зораў сетка
пяшчанае услала дно.

І пакідаць на вецер блага
такую музыку бяз слоў;
ня пырснуць серабраных ягад
пявучых у руках вяслом, —
пакуль яшчэ паэты дома,
турысты сьпяць да дзесяці,
пакуль па выцьвіўшых альбомах
не удалося разьнясьці
наднарачанскіх акварэляў.

Плывеш дзень--парусам падняць·
А ключ гусей і хмараў белых
адносе
вецер
на паўдня.

3.I.39.

*
* *

Марозны, белы вецер хіба
не супакоіцца да рана.
Цьвяты крыштальныя на шыбах
цьвітуць і пальцы мае раняць.
Там, дзе калісь глядзелі ў даль мы,
ў сьнягох паўночнае Сахары
гарaць сярэбраным пажарам
за шляхам смаляныя пальмы.
Усе год новы спатыкаюць...
А сьнег цямнейшы і гусьцейшы,
і усю ноч агнём палаюць
мае пурпуравыя вершы.

5.XII.38.

Скрыпка

Калыхаў яе вецер.
Песьні сінія хвоя
каля звонкага сэрца
апляла дробнаслоем.

Таму ведае сяньня
вуснаў шопат гарачы,
вачэй кожнае зьзяньне,
ці сьмяюцца ці плачаць.

Павядзеш толькі смыкам, —
у віно, што ня выпіў,
цьвету яблыні дзікай
або сьлёзаў падсыпе.

6.I.39.

* * *

Перагледзяць, памацаюць слова
і панюхаюць можа раз пяць.
За працяжнік, за пункт каляровы
канфіскаты наложаць пячаць.
Папытаюцца, можа знаёмы
той ці іншы замоўкшы паэт,
і як даўна кантакт з Апалёнам,
з Дзіанісам, з Сатырам і Zet?..
І пайдуць да наступнай візыты...

Посьле вочы бязсонна гараць.
І ня ўбачыш, як дзень перажыты
зноў крывёю сплывае з пяра.

11.I.39.

Вясной

Зноў загарэліся сосны над краем.
Дзе-не-дзе сьнег прытаіўся на лядах.
Звонка з вячэрняй зарою сплывае
з ніваў
　　　　крыніц
　　　　　　　　серабраная радасьць.
Плоткай іграючай быстры мой човен
выплыў мінаючы зьвісшыя дрэвы.
І ў поўнаводны, успенены Нёман
разам з другімі закінуў я невад.
Нехта русалку злавіў маладую,
нехта хваліўся на вёсцы бурштынам.
Выцягнуў сетку цяжкую і чую: —
песьня зьвініць заблытаўшыся ў ціне.
Выйшаў на бераг — усе акружылі
і пра палоў мой шчасьлівы пытаюць.

Даўна відаць рыбакі не лавілі
песень вясьняных
　　　　　　　　　　з рэк нашага краю.

3.I.39.

Зіма

(З паэмы: „Сілаш Істома“, ч. III)

Дзень цэлы плавалі вятры.
Зьвінела рунь, палын па межах.
Пад вечар сьнегам завірыў
сьпазьніўшыся кудлаты сьнежань.
На пачарнеўшую салому
сыпнуў сьцюдзёным пухам лётным,
абвіў платы зьвінячым лёнам,
раскінуў белыя палотны.
На хвалі дрэмлючай ральлі
падзьмуў з-за Сіняй Гаці сівер
і ажылі і паплылі
на лес ўзьмяцеленыя нівы.

Але навалу хмар цяжкіх
ўстрымалі выгнуўшыся хвоі.
Толькі па соснах залатых
ўзьнялося полымя сівое;
у змрочных лапках зацьвіло,
з бяроз сярэбранага вецьця
на сухастой, на буралом
яго панёс калючы вецер.
Збудзіўся нетраў цёмны гул,
з лагоўяў воўчых і выкопаў
папоўз па сьвежаму сьнягу,
па выбітых руёю тропах.

Зіма...
        Ад інію вішняк
перахіліўся за парканы.
І ня мінеш яго ніяк,
кранеш — і цьветам серабраным
асыпе з галавы да ног.
На дзяньнікі вароны стадам
лятуць з прасёлачных дарог.
Дзе-не-дзе лубіну, прынада,
сухое калева замёў
зьлягка пух сьвежа-зшаранелы,
і петлі заяччых сьлядоў
на полі іскрыстым і белым...

За гумны выйдзеш — цішынёй,
як хвалі сьнежныя ня звоняць, —
за небасхілу паласой
чарнеюць палявыя клёны.

На іх і воблакі часамі
змарыўшыся адпачываюць
і доўга-доўга вечарамі
зара гарыць, не адлятае.
А посьле шчодраю рукой
сыпне ноч зоры па дарозе.
І чуеш...
недзе пад дугой
маладзіка пяюць палозьзя...

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Разьвітаньне

Прашумеў вадапад авечак —
з лугоў у вёску воблакам сплыў —
і расплёскаў гармонік сум вечару
у задымленыя паплавы.
Ужо рагаты месяць над аўсянішчам
моўчкі жве мяккую цішыню —
заўтра ў раньня загар ня гляну я,
сярпоў шолахі не сажну.
Мо' затым так штось цягне напіцца
удоваль бражнай, вясковай тугі —
ля платоў, ля ўсьпененых дайніцаў
уззарыцца поглядам другім.
Я пайду — бяз скаргі, бяз усхліпаў —
ты яшчэ мне сном зашалясьціш —
і — бязшумнай расой асыпецца
на дарогу васеньняя ціш.
Дык бывай! Гэта змрок верасьнёвы
ў словы, пэўне, навеяў жаль —
не глядзі, што ўсхмарыліся бровы —
за вакном ясяны мітульжаць.
І калі на ростанях вулак
палян сонца упадзе ў душу —
як малітву пяшчотна-чулую
успомню словы твае — прашапчу.
Дык бывай! У дарогаў холад
жар рассыпаных сьлёз панясу —
знаю я нерасьцьвіўшую моладасьць
і разсьветаў лядзяны сум.
Дык бывай! Мглянцца цені соснаў —
анямеўшыя скрыпачы!
Я іду дзён пажоўклых восень
у бездарожжах далей валачыць.

О. МІЦЮТЕ

Роднаму месту

Падняўшы крыжы тры высока ў блакіце,
шлеш быццам малітву прадвечную ты.
Мне кожны твой шлях будзе родным, сьвятым.
Але зрок мой будзе тут сумам імгліцца.

О, роднае места, дзе шэрыя будні,
як зоры у шумны плывуць небасхіл,
вярні ты мне долю бяз мук і тугі...
Сталь гнецца і людзі ў час бурны і трудны.

Я ведаю кожны твой рытм і твой голас,
як будзяць, як ноччу калышаць званы,
чакаю... нашу свае мары і сны.
Тут неба у хварбах жыве невясёлых.

Хоць словамі ўмела-б зьвінець, а ня плакаць,—
ці твар яны зьменяць твой сумны калі?
Чужым усё буду хадзіць па зямлі,
як дзіду сваю тут зламаўшы ваяка.

Ні шчасьця, ні радасьці я не пакіну.
Ўжо дух мой зламаўся і сэрца маўчыць.
Хай вецер табе пра свабоду гучыць.
Тужыць пры сьвятых тваіх буду руінах.

Пераклаў з літоўскага М. ТАНК

ПАЎЛЮК СІРАТА

Перамога

Векі заплюшчыш, напружаны сон
грудзі раскроіць, як плугам барозны.
Нешта набухне, як боль і як скон,
нешта заплача наўзрыд і бязсьлёзна.

Заўтра з заплаканых шыбінак мар
сінім разсьветам прасочыцца ранак,
зваліць з грудзей набалелы цяжар,
сьцюжнай рукою сьціскаючы раны.

Ўстань і ў сьцюдзёным жалезе пабач
новыя вартасьці слова жывога!
І зразумееш душой — Барацьба...
і зразумееш душой — Перамога.

Горадзень, 13.XI.37.

АД. СТАНКЕВІЧ

З літуанізмаў у беларускай мове

Д.

Дабà—выклічнік, азначаючы пажаданьне: даба, каб ён згадзіўся! Літ. daba—характар, нораў, натура; dabon-déti—браць пад увагу, згадзіцца з чым. Хоць можа быць ад: даўбы Бог!

Дзёгаць, слова, якое ўжываецца ня толькі ў Беларусі, але й далёка за яе граніцамі. Літ. deginti — паліць, спаліваць, абпаліваць, выпаліваць. Адгэтуль — дзяга, дзягай абжарыць, упячы па скуры.

Дзірван — ніва, поле, пакінутае без абрабляньня, цаліна, залеж. Літ. dirvonas, але dirva—ніва, поле вырабленае. Дзірван можа быць так-жа ад бел. дзервянець, цьвярдзець.

Друскенікі—ведамае лячэльнае месца; літ. druskas—соль.

Дурдаць, раздурдаць — разбудзіць; ужываецца, калі нехта крэпка сьпіць і шмат трэба захадаў, каб яго абудзіць, прывясьці да сьведамасьці посьле сну. Літ. susidurti — стукнуцца з кім, спаткацца, саткнуцца; каб каго раздурдаць, разбудзіць — часта трэба штурхаць, рушыць, папіхаць яго рукой.

Дэнка, днышка, днушка — крышка; літ. denkti — пакрываць. Пасуду накрый дэнкам!

Дзевер — мужа брат; літ. dieveris — тое-ж.

Даржнік — загародка, пераважна пры хлеве, куды заганяюць скаціну падчас гарачыні; літ. daržas — гарод.

Доржышкі — вёска ў Ашмяншчыне, пад Соламі; ад таго-ж: daržas; daržiškai dirbti lauką: абрабляць зямлю, поле, як гарод.

Дукса — прозьвішча ў Барунах; літ. duksanti (duksauja, duksavo) — уздыхаць; duksoti (dukso, duksojo) — няясна, нявыразна віднецца здалёку (у цемнаце, у тумане).

Дзындра, зындра — ськіп жалеза ў кавальскім гарне, астаткі перапаленых кавалкаў жалеза ў каваля; літ. dzindros; dzindreti — зьвінець.

Е.

Ёрзацца — неспакойна сядзець, дуроніць; літ. erzéti — дуроніць, erzéjimas — дуронства; erzinti — дражніць, раздражняць.

Ёйня (Яўя) — еўня, авін, сушня, варыўня; літ. jauja — гумно, лазьня (дзе сушаць лён і мнуць), варыўня; адгэтуль: Ёўневічы, вёска Крэўскай вол.

З.

Зьмяркаць, зьмяркацца — цямнець, сутунець; літ. (užsi) merkti (užsimerkia, užsimerkė) — стуліць вочы, заплюшчыць, зажмурыцца; адгэтуль: змурок, зьмяркацца.

Зрэпіцца — счапіцца між сабой у барацьбе, схваціцца; сабакі зрэпіліся; літ. **reples** — шчыпцы, абцугі.

Затаўка — клустасьць, сала, што кладзецца ў страву; літ. **taukai** — клустасьць, сала; **taukuoti** — затаўкаць. Але гэта можа быць і ад славянск. — тук: клустасьць.

Жыляць — цяжкое што падымаць, робячы гэта часта і доўга; літ. **žilinti** — даводзіць да сівасьці, да старасьці.

Жвір — буйны пясок; дно нашай рэчкі жвіраватае; літ. **žviras** — тое-ж самае.

Жычка — чырвоны вузкі матузок; літ. **žičkai** — каляровыя (пераважна чырвоныя) ваўняныя ніткі, каторымі патыкаецца паводле пэўнага ўзору аснова ткані.

Жудà — цяжкі сум, расчараваньне ад вялікага гора і бяды; жудá яго заядае, ён гіне ад жуды; літ. **žudyti** — зьбіваць, нішчыць, мучыць, губіць.

Жлокаць — хутка і пажадліва глытаць, лахтаць што рэдкае: ваду, малако; літ. **žlugti** (žlunga, žlugo) — гінуць, тануць, мокнуць.

Я. КРЫГА

Можа...

Можа віхураю гнаны прыдзецца
родную хату яшчэ калі кінуць,
але ніякая бура ўжо з сэрца
вырваць ня зможа любоў да Краіны.

Тут усё блізкае, матчына — міла:
неба, зямля, лес і луг, кожна горка,
могілкаў дзедаўскіх кожна магіла, —
сьвет першых радасьцяў і сьлёзаў горкіх..

Калі прыдзецца — ў далёкай чужыне,
сэрца тугой будзе поўна, ня йначай,
але і родна вярба і рабіна
пэўне ля хаты за мною заплача.

Хіба іх можа віхура паломіць
ды разам з бацькаўскай хатай зруйнуе —
вецер мой сум сьлязой ў хмары прыгоніць,
роднае неба хоць раз засумуе.

Я. СТАНКЕВІЧ

Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг. „Аль кітаб“

Фонэтычны й морфолёгічны разбор

(Працяг, гл. № 4 (17) „Калосься“ з 1938 г.).

Аканьне

Пераход е ў а (ʻа). Пераход ненацісьненага *е* ў *а* прадстаўляецца ў рукапісе накш па сугуках цьвярдых *(д, т* і іншыя ў словах чужых) і ацьвярдзелых *р, ж, дж, ш, ч, ц* (з праславянскага *ц*) з аднаго боку, а накш па сугуках мяккіх, да каторых належаць усе асталыя, і j — з другога. Дык прыклады на абедзьве групы прывяду асобна. Дзеля таго што ў *а* (*ʻа*) пераходзіць ня толькі *е* спачатнае, але такжа *е* із спачатных *ѣ* і *ь*, дык прыклады на іх будуць прыведзены разам.

Пераход ненацісьненага е ў а па цьвярдых і ацьвярдзелых сугуках. У складох перад націскам: strała 1b17, čaho 1a10, 9a4, 20a6, 40b3, 44b9, 45a13, 138a5, 138a17, da čahu ti prišuŭ (= čaho ti prišoŭ) 62a4, 62a13, a čahu (= — o) 66b13, kričic: „čaho ležice...“ 118b2, kali čaho bajacca 121a8, uścerahu 4b10, nepereścerahaŭ 10b17, častūje 12a1, poŭ šasta funta 49b13, ʻužanuc 54b15, žanockaje 57b13, štob ne zhrašiŭ preciŭku 68b9, nečakaje 70b17, ʻabrakajecca 87a1, čamu 96b1, dastament (zam. *tastament*, распадабненьне) 105a6, čatiri 108b2, kerani 124a3, daždžavoha 47b16, ne ʻabrakajūčiśe 40a9, žana 40b11, 58a3, 58b8, 80a11 і шмат іншых, žabrakom 681, častavać 20b15, 31a14, častavaŭ 20b13, 25b1, 31b1, 31b2, ebdeś ʻu čatiruch (= — рох) rečach 74b9, pacałavaŭ 58a7.

У складох па націску: vižšahu (= — o) 5a8, inšahu (= —o) 6b11, 21b1, 89b2, 89b4, 108b8, 136b14, praśaščahu 12a2, 12a12, večara 16a3, zavešan 18a12, 17b13, zavešanij būdze 18a15, ʻadłūčani 20 11, zavešani 20b1, Peršahu (= — o) 22a10, 27a12, 83a9, peršaj 22a11, milšaho 24b1, ime boža 26b8, peršamu 40b13, pricincaju 57a11, iz mužam 58b9, kručanaje 68b2, pałcam (instr.) 71b15, da kanca pałcaŭ 73b12, velik'im pałcam 73b13, najbolšamu 78a10, ʻu mora vik'idac 78b16, stvarencaŭ 88b13, spačaho 89b14, peršaje słova 91a1, ʻadpuščani 93a10, rano i ŭvečar pejce 76b4, ŭvečar 94a2, 97a5, biło žboža (= zboža, апіска пад уплывам наступнога *ž*) 100a12, lepšaho 111b3, Z dimū stvorana peršaje neba 115a5, pabolšaje 221a4, pałacaŭ 123a3, 123a8, dzerava velmi charošaje 138b4, dušajemcam (instr.) 138b12, višaŭši 133b9, najvišaje mejsca 13b6, na čistaje mejsca 84b2, sunca (= сонца, voc.)

106a6, choraša 71b12, 115a1, meśecaŭ 22a15, 26b1, pjanicam (instr.) 64a14, tavarišaŭ 106a4, temparavaŭ (слова чужое, зь цьвярдым *п*) 114b1 і шмат іншых.

'а на месцу ненаціськенага 'е па мяккіх сугуках. У складох перад націскам: nachaj (= няхай) 7b13, na mnej (пол. nie mniej) 12a17, 'uśahu (= усяго) 21b13, lasuŭ (= лясоў) 27b5, na jeden 39b7, dzicana (= дзіцяня) 42b3, 'ahnanimi 53b12, 'ahnanije 53b9, što ja 'u jaho būdu pitac 59b8, 'u pasuk (= пясок) 69b6, 81b2, is pasku 81b2, 81b4, paskom 81b3, tlajancegu (= — о, у польскім тэксьце) 104a14, na pisali (= ня піс-) 137b14.

Так сама маем *а* ў прыслоўным прыймені *каля* з *кале*, паўсталым скасьцяненьням loc. sg. *колѣ*. Націск гэтага слова пераходзіць на слова наступное (прыр. *kala* й *kale* E. Klich, Teksty, 184): kela śebe 84a13, biŭ zabaŭnij kela taje tablici 125b4.

У словах, як 'upovadać 67a16, 'u vadomości 76b12, vadomość 107b6, трэба бачыць полёнізмы, на што паказуе ненаціськенае *о* ў іх.

У складох па націску: 'astatnamu 5b17 'astatnahu (= —о) 26a13, 50a9, trecaje 34b5, 34b9, z bajaz'naju 36b7, bež mužnaho (апіска зам. *bez*) 40b9, Pałūdnaŭ kolka 41b17, 42a1, kuflaŭ 56a11, prepomnaŭši 65a2, 'ūtoplana 68a17, bajaz'naju 64b5, Pred gergerejam (instr. sg. ад араб. gergerej) 71a10, śerednaju darohaju 81b14, 'u rannam 89b12, trecam 114a4, na trecaje neba 116b9, rastoplana 128b6, iz cicok vidajana 64b13, śvetłaścaju 95b10, Trecaja neba 117a1, z radaścaj 126b2, prijecelaŭ (націск на *пры* —) 18b17, prijecelaŭ mus'ulman 117a4, majuc peść (зам. jeść) vuhalja 10b13, 'adzena... pašarpana 19a7, nadzevajce rajśkaje 'adzena 56a2, Bahamolja žanockaje 57b13, biło na jom 'adzena 109a3, pacehnūŭ 'adzena 109b9, inšaje 'adzena 110a2, toje 'adzena 110a5, chadzena maju (= majo) 120a5, 'adzena dam 121a5, každaje 'adzena 122b8.*)

Прыкладаў, прыведзеных на пераход ненац. *е* ў *а* (*'а*) даволі, каб сконстатаваць, што ў мове «Аль кітабу» кажнае ненаціськенае *е*, як па цьвярдых, так і мяккіх сугуках пераходзіла ў *а* (*'а*). Астаецца толькі выясьніць, чаму па сугуках мяккіх прыкладаў на гэты пераход ё прыраўнальна мала (колькасьць іх блізу агранічуецца вышпрыведзенымі).

'е на месцу ненаціськенага этым. 'а па мяккіх сугуках. У «Аль кітабе» звычайна пішацца *е* такжа на месцу ненаціськенага *'а* этымолёгічнага (із спачатных *ja* і *ę*). У складох, што ніколі ня былі пад націскам, аўтар «Аль кітабу» піша *е* на месцу этымолёгічнага ненац. *'а* па мяккіх сугуках бязь ніякіх ад-

---

*) Аўх. Карскі, II-1, 363 ўважае, што канцавое а ў групе сугук+ьj+е па шчэзьненьню ь і ўпадабненьню j да папярэдняга сугуку паўстала пад уплывам здвоенага або ўзмоцненага сугуку (vuhalla), як гэта ё ў украінскім языццэ. Але ў украінскім а ('а) ў гэтай групе ё і пад націскам, тым часам у беларускім толькі ў палажэньню бяз націску. Дык ясна, што і ў гэтай групе словаў маем у беларускім языццэ да чыненьня з аканьням.

хінаў. Да таковых хормаў належаць дзеяслоўныя прыслоўі на — *'ачы* (у «Аль кітабе»: lubeči, čineči і пад.), 3 pl. praes. (činec, chodzec і пад.), займя *ся* (із sę) у дзеясловаў зваротных (maliũśe і пад.), таковыя словы, як kłanejecca, tiśeča і пад. У прыпадках іншых, дзе склад быў напару пад націскам у іншай хорме,або ўплывала аналёгія тае-ж хормы іншых словаў з *'а* націсьненым ё такжа прыклады з правільным напісаньням із *а*, прыкл. praca taja 34a12, бо тая-ж хорма іншага займені мае пад націскам *а:* maja і пад.

Падобна як у «Аль кітабе», *е* на месцу ненацісьненага *'а* ўжывалася такжа ў беларускіх памятках абэцэдай кірыліцкай.*) Карскі, Бѣлоруссы II—1, 95 сьхінаецца да думкі, што старыя памяткі гэтай асаблівасьцяй адбіваюць жывую тагачасную вымову. Але з гэтым нельга згадзіцца. Калі гэткая вымова была ў XV—XVII стаг., чаму яе няма цяперака ані на віленска-ашмянскім прасторы, у каторага мове напісаны «Аль кітаб», ані на 9/10 з гакам беларускага языковага прастору наагул. *е* на месцу ненац. *'а* этымолёгічнага ведама часткава ў беларускіх гутарках палескіх, дзе яно зьявілася ў часе ўтрачаваньня аканьня, пайменна, імкнучыся да вымовы *е* замест *'а* зь ненац. *е*, Паляшукі сталі вымаўляць такжа *е* на месцу *'а* спачатнага, бо ў ваБодвых прыпадках *'а* вымаўлялася аднолькава.

Там-жа на Палесьсю — з тае-ж прычыны паўсталі прыпадкі зь ненацісьненым *о* на месцу этым. *а* (*постух, моліны, руковіцы* і інш.).**)

Дык разгледжаная зьява ё асаблівасьцяй правапіснай, а не фонэтычнай. Яна паўстала як у крывіцкіх тэкстах кірылічных, так і ў тэкстах арабіцаю, пры чым, відавочна, самастойна ў вадных і другіх. Пісьменьнікі арабіцаю натолькі былі незалежныя ад кірылічнага правапісу беларускага, што выдумалі апрычоныя значкі дзеля *дз* й *ц*. Выхадным мамэнтам у пісаньню *е* на месцу этым. ненац. *'а* па мяккіх сугуках было ймкненьне да этымолёгічнага правапісу. Прызнаць гэткае ймкненьне ў ваўтара «Аль кітабу» ці — шырэй — у пісьменьнікаў арабіцаю наагул мы можам, нягледзячы на звычайны пераход на пісьме ў нашым рукапісе ненац. *о* ў *а*, бо і ў літаратуры кірылічнай лучаюць памяткі, як прыкл. беларускі зборнік XVI стаг. Чудава м-ра № 62—264,***) з такім самым

---

*) Stang Chr. S., Die westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen, бач. 70. паказаў, што ў стара-беларускай мове літаратурнай гэтая асаблівасьць зьяўляецца ў канцы XV стаг., калі на гэную мову мелі ўплыў паўночна-ўсходнія гутаркі беларускія.

**) Ossowski L., Przyczynki do białoruskiej dialektologji (Сборникъ Милетичъ, Софія 1933).

***) Библіографическіе матеріалы, собранные А. Н. Поповымъ..., изданные подъ редакціей М. Сперанскаго. Масква 1889.

частым і вялікім аканьням, хоць там правапіс быў этымолёгічны.

Пішучыя пакрывіцку стараліся абазначаць пры помачы *е* тое *а*, што паўстала з *е* ненац.; а дзеля таго што аднолькава вымаўлялася і *а* этым. па мяккіх сугуках, дык і замест яго сталі пісаць *е*, бо вельмі часта трудна было разабрацца, дзе якое *а* ёсьць. А з часам гэткі спосаб пісаньня стаў правапіснай нормаю.

а (спачатнае і з *е*) па мяккіх сугуках вымаўляецца вузей, як па ацьвярдзелых, дзеля таго толькі па мяккіх у складох ненацісьненых паўстаў спосаб абазначаць ненацісьненае *а* пераз *е*.

Цяпер ясна, чаму малую колькасьць прыкладаў маем у нашым рукапісе на пераход ненац. *е* ў *'а* па мяккіх сугуках: абазначаючы пры помачы *е* ненац. этым. *а* па мяккіх сугуках, аўтар ня мог абазначаць пераз *а* таго *а*, што паўстала зь ненац. *е* па мяккіх сугуках.

е на месцу этымолёгічнага а па *к, х, т* і *'* (*айн*). Зь іншае прычыны пішацца ў рукапісе *е* на месцу этым. *а* па *к, х, т* і па айн ('). Туркі й Татары а таксама крывіцкія мусульмане літару *е* па *к, х, т* ды *е* з *'* (айн) вымаўляюць як *а*.

Ведама, што ў даным прыпадку спосаб абазначэньня гуку *а* нашыя мусульмане пераняли ад Туркаў і Татар. Дык і аўтар нашага рукапісу пры помачы *е* па *к, х, т* а такжа пры помачы *'е* (*е* з айн) абазначае гук *а* рознага паходжаньня (спачатнае і зь ненац. *о*), аб чым я ўжо зацеміў у № 4 (17) «Калосься» з 1938 г., бач. 245 долех, 246 ўверсе, 248 долех і 249. Колькі прыкладаў: kezan kezaŭ s prikezane (= казань казаў с прыказаньня) 13b13, patetarśku 86b17, łaske (= ласка) 28b17.

о на месцу ненацісьненага этым. 'е маем у гэткіх прыкладах: spaśenjom učinū 46a6, aźančejom (клічучым на малітву) biŭ 89a3, navernu (= навернё) 103b17, Priazdobic dla cebe nebosa, radujucca, što ŭvidzeŭ praroke 109b5, Pan Boh 'ušelakoju (= — jo) žadane jeho prijme 25a3, vī toju (= tojo) papełnajece 28b12, peršaje, iz k'afiremi poŭstane; drūhoju (= — jo), tvaru śvinoju 34b9, na levuju (= levojo) plečo 'uz'lij 71b2, kažnajo kriło 109a1. У прыведзеных прыкладах маем да чыненьня з гіпэрправільнасьцяй, як рэзультат імкненьня аўтара рукапісу да этымолёгічнага пісьма.

а на месцу ненацісьненага у ў канчатку ac. sg. складаных нясьцягненых прыметаў і пад. (*новаю, добраю* хату пры *старую* або *нову, добру, маладу* — хормы сьцягненыя й іменныя) А. Шахматаў («Русское и словенское аканіе» ў «Р.Ф.В.») такжа лучыць із аканьням. На гэтую асаблівасьць у нашым рукапісе лучыла 7 прыкладаў: 'u praŭdzivaju darohu 'upravadz 4b12, velikaju preškodu 42b12, śehośvetnaju razmovu 43a15, pasłūhu

velikaju činiŭ 62a11, muku velikaju 68a1, u čistaju z'emlu 73b.0, iz rajškaj švetłašci na cemnaśc sveckaju 77b17.

Нягледзячы на тое, што аўтар рукапісу ў ac. sg. (він. адз. л.) жаноцкіх прыметаў і пад. звычайна піша — *ую*, нельга сумлявацца, што вышпрыведзеныя прыклады адбіваюць жывую тагачасную вымову. Аўтар «Аль кітабу», імкнучыся да этымолёгічнага правапісу, пісаў звычайна — *ую* ў *ac. sg.* пад уплывам прыметаў маючых націск на канчатку (*малую*).

У цяперашняй беларускай мове народнай ненац. канчатак на — *аю* ac. sg. fem. прыметаў ёсьць у віленска-ашмянскіх гутарках, на прасторы каторых напісаны «Аль кітаб», у дыялекце цэнтральным разам із северскімі гутаркамі і ў вабруселай мове крывіцкіх (беларускіх) Вяцічаў (т. зв. цяпер паўднёва-расейскім нарэччу). У крывіцкім дыялекце дысыміляцыйным *а* ў канчатку — *аю* перайшло ў-*ы*-, ё, значыцца, -*ыю* (*новыю*).

Карскі (II—1, 296 і II—2, 315) у канчатку — *аю* ac. sg. fem. бачыць уплыў nom. sg. (наз. адз. л.), хоць ac. sg. мае балей стычных пунктаў із instr. sg. (тв. адз. л.). Але калі зьвернем увагу, што адно ненац. -*у*- ў канчатку ac. sg. перайшло ў -*а*-, дык мусім згадзіцца із Шахматавам, каторы бачыць тут зьяву фонэтычную, значыцца аканьне. Роля instr. sg. была-б тут адно памочнаю.

Канчаючы аб аканьню, трэба сказаць, што ў мове «Аль кітабу», а значыцца ў віленска-ашмянскіх гутарках XVI стаг. кажнае ненацісьненае *о* й *е* пераходзіла ў *а*(*'а*),*) у некаторых прыпадках такжа ненац. *у*, а хіба і *ы*, *і* пераходзіла ў *а*. Значыцца характар віленскага аканьня XVI стаг. быў аднолькавы зь цяперашнім.

На аснове аднаго дагэтуль разгледжанага матар'ялу з нашага рукапісу можам сказаць, што аўтар ягоны імкнуўся ў вабазначэньню самагукаў да этымолёгічнага правапісу, што яму ў ваднасінах да ненац. *е* па мяккіх сугуках ды што да ненац. *у* ў канчатку ac. sg. прыметаў жан. у вялікай меры ўдавалася.

Іншыя зьмены самагукаў а, о, е, ѣ.

Зьмена самагуку *а*.

Пераход *а* ў *о* маем: 1. Перад нескладатворным *ў*: kłoŭ 12b5, 12b7. Тутка *ў* выклікала лябіялізацу *а*, у рэзультаце чаго гэты самагук перайшоў у *о*. Гэта зьява таго самога характару, што *о* ў poŭdna, poŭstane і пад., дзе вусьнянае *ў* пры-

*) аб двух вынятках што да **о** было сказана вышэй.

чыніла, што ў *о* перайшло *а* зь ненац. *о*, або *ў* не дапусьціла пераходу ненац. *о* ў *а* — залежна ад таго, якая зьява—аканьне ці лябіялізаца *а*—старшая (гл. № 4 (17) «Калосься» бач. 250). Хормы тыпу *клёў* на прасторы віленска-ашмянскіх гутаркаў я назіраў у ваколіцы станцы Багданава Ашмянскага пав.—у сяле Рымавічы і інш. У гэтай мясцовасьці вымаўляюць *казоў, доў, узёў, дзёўчына, зоўтра* і пад. Але колькі вёрстаў ад Багданава ў сяле Войштавічы і м. Вішнева гэткай вымовы нямашака. Мярней гэтая асаблівасьць выступае ў Краўской вол., дзе я назіраў яе ў сяле Арляняты.

2. *о* ў tros 73b17 (цксл. tręsu—tręsti) паўстала з прычыны чаргаваньня ненацісьненага *а* з націсьненым *о* (*нясу-нёс, вязу-вёз* і пад.).

3. *о* на месцу націсьненага *а* маем такжа ў лічбе *абодва*: 'abodvim 13b8, 79a13, 87b12, 'abodvich 17a8, 110b8 побач із траха аднолькавае лічбы з *а*: 'abadva 116a7 і інш. Карскі, II—1, 89 выясьняе паўстаньне гэтае зьявы так, што ў канцавым *а* першае часьці складзенага слова (*оба*) пачалі бачыць самагук суфіксу, «як у нейкім «ледоход». Але Крывіч гэтак ніколі думаць ня будзе, дзеля таго што ў складзеных словаў суфіксны самагук *о* з прычыны аканьня заўсёды гучыць як *а*, бо націск на гэтым складзе бывае адно як радкі вынятак. Тут зьдзеіў уплыў слова „*абое*", дзе *о* спачатнае.

Два апошнія прыпадкі пераходу *а* ў *о* ведамы ўсім крывіцкім дыялектам.

Таксама агульна-крывіцкім ё замена нац. *а* на *е* ў слове „*глядзеці*": hledzeči 112a2, 112a3 (тут націск на *гле-*) На зьмену гэтую магла дзеіць аналёгія (падобнасьць) дзеясловаў із насовым інфіксам у цяпер. часе (у крыв. *сяду-сесьці*).

Не пераход *а* ў *і*, але апіску пад уплывам папярэдняга *і* маем у skaržiliśi 113b7.

Зьмена самагуку *о*

Пераход ненац. о ў у хіба трэба бачыць у прыкладзе hrūmadami 95a6, бо спадзяваліся-б, што ненацісьненае *о* перайшло-б у *а*. Гэткая вымова хіба ё на цэлым прасторы віленска-ашмянскіх гутаркаў, запісана мною ў Арлянятах Краўское вол. Пераход *о* ў *у* тут стаўся пад уплывам наступнога вусьнянага *м*.

Дыфтонъ (двугук) на месцу о хіба адбіваецца ў слове praruok 28a17.

а зам. *о* пад націскам у слове kalke 43a3 трэ выясьніці недаглядам.

У прыймені пісаным preciŭ (= *проці*) трэба бачыць псэўдоэтымолёгічнае напісаньне з *е* замест *а* зь ненац. *о* пад уплывам пол. przeciw.

Адноўчы лучыла priciŭ 89аб — апіска пад уплывам наступнога *i*.

о прыстаўное маем у прыслоўным прыймені *акром* з *окромъ*: 'akrom 25a13, 48b14 і інш. Прыкладаў мноства, адхінаў нямашака.

о адпалае ё ў слове «спадар» з гаспадар з *gostьpodarь: Spadaru Bože, čistaje vada tvaje 'ačišci cela maje hrešnaje 71b17, Bože Spadaru, jestem s pasku stvuronij (= stvo-) 81a10, Bože Spadaru, ja jestem is pasku stvuronij i znovu 'u pasuk (= пясок) pajdzu (зам. pajdu) i paskom būdu 'abernenij 82b2. Але ё такжа гэтае слова (і другатворныя) з пачатным *га-*(*го-*): Jak vele pakojeŭ činū bez hospadara, dušu 'az'mu velik'im strachem tak 126b6, haspadarstve 12a15, ŭ haspadarstve da trech dnej pri vas buduči 12a16. Як бачым ужо з прыведзеных прыкладаў, дзьве хормы разгляданага слова розьняцца між собку і значэньням, пайменна *спадар* ужывалася ўadносінах да Бога і (як із іншых памяткаў ведама) было ветлым зваротам да людзёў.

У слове «гарод» — 'u harodze, 'u sadu 73a14 побач із 'eharodem 78a17, 'eharodi 124a1 — *о* не адпала бо, як добра кажа Карскі, II—1, 174, тут ё апрычоны морфолёгічны твор, значыцца, слова «гарод» паўстала з «гарадзіць».

Зьмены самагуку *е*

У крывіцкім язычцэ з *е* спачатным зьлілося *е*, паўсталае 1) вакалізацай *ь*, 2) *е* ў групе *-er-* з прсл. *-r-* сонант. із самаг. элемэнтам, 3) *е* ў паўнагалосьсю, паўсталае з праславянскае групы *-er-*. З выняткам часьці дыялектаў з *е* зьліўся такжа двугук ѣ. Дзеля таго аднак, што *е* із спачатнага ѣ пры некаторых зьявах розьніцца ад *е* асталых, дык аб е з ѣ будзе гамонка асобна.

Пераход е ў о. Па зьмякчоных сугуках перад цьвярдымі націсьненае *е* пераходзіць у *о*. Прыкладаў мноства. Прывяду адно некаторыя: ščodrašci 1b3, ščodrich 11a8, panižonuju 13a7, naŭčonich 13a14, nebos 1b7, šomaje 17a3, 'u z'elonam 18b15, zaŭšohdi 19a14, išuŭ (= ішоў) 29b9, zišoŭ 41a4, šostaje 42a14, 45a13, imona 54b3, 54b10, mod 65a4, ves'olahu 105a10, prinos 113a2, ucok 80a1, dnoŭ 27b10, vūžoŭ 129b8, mūžoŭ 129b5.

У таковых, як *мужоў, днёў* барждзэй *е* перайшло ў *о* нефонэтычна, але па аналёгіі з канчаткам *о-* асноваў.

Не фонэтычны ё пераход *е* ў *о* ў instr. sg. (тв. адз. л.) ў асноваў мяккіх: 'ajcom 22a8, dažčom 47b14, dnom 96b15, 'ehnom 128b1, kanom 111b6 і г. д., бо спачатна тут было—*мь*. Так сама ў мяккіх ja- асновах: z'emloj 126b9, dušoju 29b2 і г. д. Замена тут сталася аналёгічна пад уплывам асноваў цьвярдых (*сталом* з *сталъмь, жаною* і пад.).

Так сама аналёгічна подле *томь* паўсталі хормы займёнаў мяккіх асноваў masc., n. ў loc. sg.: na šom 2b10, 'u jom 14b4, ni ŭ čum (= чом) 17b17, na ŭšom 19a16 ū dome svajom

25a17. Гэтыя хормы ў бальшыні проці хормаў з *e*: na sūdze svajem 10a9, 'u domu svajem 12b11, 12b12, 31a14 і інш.

У gen., dat., loc., instr. sg. займ. мяккіх асноваў жаноцкіх: starajceśe majoj 'udzačnaści 11a5, nad matkaj majoj 11a14, vulej (=волей) svajoj 3b8, 'e (= a) majoj prihodze 19b4, łask'i majoj ne bū-dze 26a9, da chełapji majoj 36a4, ŭ moci majoj 61b1, 'us'oju 82b5, 'u majoj 84b16, joj (dat.) 100a1, u łasce majoj 81b4, svajoj (instr.) 99b16 і г. д. Тут *o* паўстала аналёгіяй dat.-loc. *той*, instr. *тою*, адгэтуль хормы з *o* прайшлі такжа да gen. sg. Але большая колькасьць прыкладаў ёсьць із *e* ў гэтых склонах: da łask'i svajej, 'u łasce svajej 12b13, svajeju 15b5, 28a10, 30b17, da majej 29a11, pa tvajej śmerci 33a16, čijej 38a16, tvajej (dat.) 52b9, majeju 70b11 і інш.

e не пераходзіць у *o* перад ацьвярдзелымі *ж, ч, ш, ц*: ne jdzeš 53b1, upjecce 63b2, napjecca 63a16, adzežu 70a3, 72b17, 74a4, 'abrečeśše 83a12, peješ 83b7, 84a17, pluješ ib., 'adervecca 126a3, śmejecca 131a7, razdzerecca 1b6 і інш.; адхінаў нямашака.

Так сама перад ацьвярдзелым *м* няма пераходу *e* ў *o*: cemnośc (з тьmьnostь) 34b5, cemnaśc 77b16, 78a4, cemnaści 78b10, 79a7, cemna 108a5, 108a6, толькі адзін раз стрэлася comnich 79b1; karčemnije (з kъrčьmьпъ) 63a1, 63b2, dušejemca 125a6, dušajemcam 138b12, tajemnuju 105b2, tajemno 130a3, tajemnije 138a16.

e не перайшло ў *o* ў lehъk-: lechka 19a6, 79b14, lechko 35b11, lechk'im 94b8, 'ulechce meli 129b5, 'ulechce mec 138a9, 138a10. У цяперашняй мове кажацца «улехца» (ехаць), але «лёгкі, лёгка».

У мове «Аль кітабу» *e* не пераходзіць у *o* ў infin. (неазначаным ладзе) 1 клясы 6-ае групы: 'umerci 30a7, 39a16, 137b5, 106a10, pacerc 72b5, umerci 53a5, 68b7, cerci 48b16, cerc 43a5, ucerc 113b9. Цяпер у віленска-ашмянскіх гутарках дзеясловы 6-ае групы 1-ае клясы маюць у неазначаным ладзе толькі *o* (*цёрці, умёрці* і г. д.).

Далей ё *e* ў парціціпіех тае-ж групы дзеясловаў: 'umerłaho 18b14, raspaścerši 83b2, 83b4, 'abernenij 81a1, 81b3, 'umer 39b8, 105a5, umerła 104b9, 'aperłaśe 108b7. Але стрэліся два прыклады і з *o*: raśpaścorši 73b10 і 'umor 18b11. Цяпер у віленска-ашмянскіх гутарках менаваныя хормы маюць у бальшыні *o* (*умёр, умёрлы*, хоць *зьмерз, зьмерзлы*), значыцца пазьней у гэтых гутарках пашырыўся процэс, што адно пачынаўся ў XVI стаг.

У дыялекце паўднёва-заходнім дзеясловы 6-ае групы 1-ае клясы захавалі дагэтуль *e* ў поўнай сіле ў неазначаным ладзе і ў складзе -ер- з *-r-* сон. у парціціпіех і ў іншых часьцёх мовы. Не ў парціціпіех захавалася *e* гэткага паходжаньня ў большай меры такжа ў віленска-ашмянскіх гутарках. Прыкл.: umiérłyje Ваўк. п. Feder. I, 69, žèrdočka Навагр. п. Klich, 220, бèрда Ашм. п., мой запіс, čaćviérty Ваўк. п. Feder II, 20 і інш.

У мове «Аль кітабу» апрача адхінаў перад ацьвярдзелымы сугукамі, значыцца перад *ж, ч, ш, ц* і *м* з *мь*, асталыя адхіны дваякія. Адныя, як тегсі могуць быць выясьнены тым, што *е* не пераходзіць у *о* перад мяккімі *складамі*. Гэткае правіла ўстанавіў у польскім языцца *Я. Лось* („Gramatyka polska" 1922 г., I, 34), а ў украінскім *А. Крымскі* («Украинская граматика» 1907 г., I, 395). Няпроста выказаўся за гэта *А. Сабалеўскі* ў «Лекціи"», 1907, 66, 3 адступ. Подле гэтага ў lechk'i па шчэзьненьню *ъ* і зьмякчэньню *к* другі склад быў мяккі. Аналёгіяй lechk'i асталося *е* не зьмяніўшыся ў *о* ў lechka, як у цяперашняй мове тых-жа прастораў пад уплывам adv. *далёка* паўстала *далёкі* (*о* з *е* перад мяккім *к*). (*Далей будзе*).

АНАТОЛЬ ІВЭРС

* * *

Чым прыкавала ты, вёска, мяне —
доляй сваёй ці нядоляй? —
Ведаю — смутак, бяда праміне
ветрам гуляючым ў полі.

Не падкрадзецца зара, як калісь —
самі яе мы прывабім...
Будзе кружыць ападаючы ліст
ў хор заміраючы жабі.

Ды вераб'і на гумне на страсе
спрэчку аб нечым падымуць,
толькі адходзячых вырай гусей
зьнікне балюча у дыме.

І распаложыцца сьнежная бель
ўзорам бялейшых палотнаў —
тады можа песьню злажу я табе
рукой мазалістай і потнай.

Збуджаны верш

Мы ня плакалі ўчора, як цісную мароз.
Сёньня мутнае неба ня хоча зьвінець.
На дарозе ў сустрэчным паходзе бяроз
мы расталіся неяк ў тваёй старане.
За імглою імгла налятала няраз —
на шляхі маладыя і вольную шыр,
дзе заўсёды займаецца жарам зара, —
яе вецер расхіне—ня можа стушыць!..
Вочы сінія вабяць цябе мо' й цяпер
і плывеш ты у думках на хвалях жытоў...
Успамінамі раньнімі збуджаны верш
з грудзей вырваўся ў даль—я ня знаю нашто.

М. ШКЯЛЁНАК

Культурнае рабства

Маем на мэце тых Беларусаў з паходжаньня, каторыя асыміляваліся культурна, прыняўшы «вышшую» польскую або расейскую культуру. Гэткіх Беларусаў асабліва шмат можна спаткаць між нашай інтэлігенцыяй, як даваеннай гэтак і пасьляваеннай. Людзі гэтага тыпу лічаць сябе нават Беларусамі, але кажуць, што культурна яны Расейцы або Палякі. Гэтае ненатуральнае злучэньне паняцьцяў магчыма толькі пры поўнай нэгацыі самастойнасьці беларускае культуры. Апошняя ў іх разуменьні мае зьмясьціцца ў рамах польскасьці або маскоўшчыны, як нешта рэгіёнальнае, нязначнае, над чым ня варта спэцыяльна працаваць. Зразумела, што гэта культурная асыміляцыя вядзе няўхільна і да ацыміляцыі дзяржаўнай, інакш палітычнае. Гэткія Беларусы пераважна зьяўляюцца больш ці менш выдатнымі расейскімі і польскімі дзеячамі. З пільнасьцю, уласьцівай усякім нэафітам, яны шыраць у нас расейскую і польскую культуру энэргічней ад запраўдных Палякоў і Расейцаў.

Гэткага адносаньня да чужых культур ня можна інакш назваць, як *рабствам,* а засыміляваных культурна Беларусаў — рабамі. Паняцьце раба супануе заўсёды паняцьце пана. Немагчымы раб, які-б нікому ня служыў. Панам можа быць ня толькі фізычная асоба, але і адарванае паняцьце, як прыкладам чужая культура. Характэрнай азнакай узаемаадносінаў між рабам і панам ёсьць сьляпое, бязкрытычнае служэньне *чужым* панскім інтарэсам. Раб, які пачынае крытыкаваць свайго пана, або разумець, што служа *чужым* інтарэсам, ужо ня будзе рабам. Побач з гэтай сьлепатой і бязкрытыцызмам у раба наглядаецца заўсёды *пагарда* да сябе, да свайго. Дзякуючы гэтым азнакам у старажытнасьці раба лічылі проста прадметам. І гэта правільна, бо немагчыма лічыць поўнавартасным чалавекам адзінку, якая сама сябе чалавекам лічыць ня хоча, а прыраўноўвае сябе да панскае жывёлы, мэбляў і г. д. Кажуць: «рабы ненавідзяць сваіх паноў». Вось-жа гэткіх рабоў немагчыма лічыць рабамі. «Узбунтаваныя» рабы — ўжо не рабы. Гэта людзі, якія пачынаюць разумець свае інтарэсы і імкнуцца да вызваленьня. Маем на мэце толькі рабоў сьляпых, адданых бязкрытычна пану. Гэткім панам, як зацемлена вышэй, можа быць і чужая культура.

Рабоў у вапошнім разуменьні мы, Беларусы, маем поўна. Хіба ня знойдзецца сьведамага Беларуса, які-б ня стыкаўся з Беларусамі—рабамі чужых культураў. Адданасьць гэтых Беларусаў сваім панам ёсьць часта задзіўляючай.

Дзе карані гэтага духовага рабства часткі нашае інтэлігенцыі і ў чым практычна яно праяўляецца?

Мы ня будзем зьвяртацца ў мінуўшчыну, каб вытлумачыць гэтае зьявішча, хоць і тады ўжо ў нас гэтае рабства пашыралася. Досыць успомніць ведамы сказ тагачасных напалавіну засыміляваных культурна Беларусаў гаварыўшых аб сабе: «gente Ruthenus, natione Polonus», ды ведамы зварот з прамовы смаленскага кашталяна Мялешкі, сказаўшага аб гэткіх рабох, што яны хоць і свая косьць, але абрасла сабачым мясам і ваняець. Здаецца, што культурнае рабства часткі нашае інтэлігенцыі можна выясьніць іншымі дзейнікамі, а галоўна псыхолёгічнымі.

Інтэлігенцкім культурным рабом у некаторай ступені трэба нарадзіцца. Трэба ад нараджэньня мець *прэдыспозыцыі* да рабства. Рабская псыхіка ў чалавека з псыхічнымі склоннасьцямі да няволі, калі ён апынецца ў спрыяючых умовах, багата разаўецца. Нявольніцкія прэдыспозыцыі будуць пхаць абдзеленага імі інтэлігента да шуканьня *сілы-пана,* у рабства якой гэткі інтэлігент дабравольна йдзе коштам рэзыгнацыі з сваей людзкой годнасьці. Гэтае рабства дае яму духовы супакой, парадкавае яго сумленьне. Гэткі інтэлігент пачынае глядзець *на сябе самога* вачмі свайго пана, будзе згадваць яго волю і паступаць са сваімі гэтак, як паступаў-бы пан, калі-б быў на ягоным месцы. А якія-ж спрыяючыя ўмовы патрэбны дзеля разьвіцьця рабскіх прэдыспозыцыяў. Ясна, ідзе тут аб умовы створаныя дадзеным панам, трэба трапіць у сфэру ягоных уплываў.

Гэткім парадкам культурнае рабства беларускага інтэлігента з нявольніцкімі склоннасьцямі азначыцца паводле таго, у якога пана ён апынецца. Беларусы *расейскае* культуры маглі-б быць дужа добра *польскай,* і наадварот, бо іхняя культурная асыміляцыя залежыць ад таго, куды яны перш трапілі і якой атмасфэрай перш дыхалі. Гаворачы аб людзях з псыхічнай склоннасьцю да культурнае асыміляцыі, мы, зразумела, ня маем на мэце тых, якія з карысных мэтаў пакрываюць сваю прыналежнасьць да расейшчыны ці польшчыны. Маем на мэце толькі тых культурных рабоў, якія працуюць на свайго пана бязінтэрэсоўна, сумленна. Гэткія Беларусы ў кожных найнепамысьнейшых абставінах будуць працаваць на карысьць асыміляваўшае іх культуры. Годзі ўспомніць для прыкладу, колькі Беларусаў з усей адданасьцю працуе між расейскай эміграцыяй бяз усякай матарыяльнае нагароды. Ведама агульна, што ўмовы іхняе працы з кожнага гледзішча вельмі цяжкія, аднак гэта іх ня пужае. Тут якраз мо' маем клясычны прыклад культурнага рабства часткі Беларусаў з паходжаньня, прыклад сьляпой адданасьці свайму пану.

Ці апрача псыхічных склоннасьцяў да рабства ёсьць іншыя яго прычыны, — гадаць ня будзем. Лічым гэтую прычыну найважнейшай. Іншая рэч, скуль бяруцца гэтыя рабскія прэдыспозыцыі ў натуры чалавека. Магчыма тут мае сваё

значэньне пераймо ў спадчыне свайго роду «камплексу нізшасьці», як плоду паравяковага залежнага жыцьця беларускага народу. Камплекс собскае нізшасьці перадаваўся з пакаленьня ў пакаленьне, як заразная хвароба, і стварыў гэтыя нявольніцкія склоннасьці ў псыхіцы некаторых Беларусаў.

Мы сказалі, што беларускі культурны раб азначаецца пагардай да сябе і свайго і на ўсё глядзіць вачмі пана. Пан-жа «літуецца» над рабамі і даказвае ім, што яны не зьяўляюцца поўным нулём, але нейкай часткай яго панскай істоты. Пан дапушчае рабоў у сваю культурную грамадзкасьць, як радню, а ня купленых дзесь на міжнародных рынках чужаземных іншапляменных нявольнікаў. Падчырківаем гэты мамэнт «радні» з панам, бо ён для культурных рабоў мае колёсальнае значэньне ў сэнсе ўспакаеньня іхняга рабскага сумленьня. Ведаць, што сам пан міласьціва залічвае іх побач з іншымі чужапляменьнікамі, якіх у яго многа, да свае супольнасьці, для нявольніка важна. Тады раб ня чуе сябе ізаляваным, нейкім прыблудай, а толькі «сябрам» панскай культурнай цэласьці. Лічучы раба «сваім», пан загадвае яму прапагаваць гэтае «ганаровае радство» між сваімі аднапляменьнікамі і адначасна шырыць пагарду да тых, каторыя гэтага «радства» выракаюцца. Гэткім парадкам асыміляваныя культурна Беларусы на перабой заганяюць беларускую культуру да расейскай або польскай. Сам тэрмін «беларуская культура» выклікае ў гэтых людзей абурэньне. «Какая может быть бѣлорусская культура»?—Co to jest kultura białoruska»?—іранічна пытаюцца гэтыя асобы паходзячыя часта з аднае беларускае сям'і і ў найлепшым прыпадку паціскаюць плячмі. Згодна з загадам сваіх паноў, яны прызнаюць беларускую культуру, як малазначную народную творчасьць у рамах вялікіх польскіх або расейскіх культурных дасягненьняў. У сьляпой адданасьці сваім панам, гэтыя асыміляваныя Беларусы ня хочуць бачыць абсурдальнасьці сваіх вывадаў, паіменна, што беларуская культура, якая-б ня была яе параўнальная вартасьць, ня можа быць адначасна польскай і расейскай. Залічаньне яе да расейскай тым самым выключае думку аб яе польскасьці і наадварот. Але гэтая супярэчнасьць, як аказваецца, зусім ня псуе адносінаў між нявольнікамі розных паноў. Ідзе аб тое, што паны гатовы лепш дапусьціць гэтую абсурдальную супярэчнасьць, над якой можна падыскутаваць, чымся пагадзіцца з існаваньнем асобнай беларускай культуры і гэтым дапусьціць у сваё асяродзьдзе небясьпечнага бунтаўніка. Нэгацыя беларускасьці, як нейкай апрычонай культурнае цэласьці, лучыць паноў і рабоў. Успомненая-ж абсурдальная супярэчнасьць выклікае толькі «навуковую» дыскусію, ведзеную галоўна беларускімі рабамі. Паўстаюць вялізарныя томы «навуковае» макулятуры, з помаччу каторай Беларусы «двух культур» у помач сваім паном стараюцца даказаць польскасьць

або расейскасьць беларускае культуры. Гэтая макулятура ёсьць паказальнай для ўсіх і, як вочы зьмяі на птушку, дзеіць на душы тых-жа Беларусаў з рабскімі склоннасьцямі.

З пачуцьця радні з «панскай» культурай плыве пагарда раба да сваей. Інтэлігенцкі беларускі раб хоча ўва ўсім быць падобным свайму пану. Пляма, аднак, «няпанскага» культурнага паходжаньня мучае раба і магчыма ад часу-да-часу ўзварушыць яго сумленьне. З тым большым разгонам кідаецца ён на нішчэньне сьлядоў собскага паходжаньня. Іменна сьлядоў паходжаньня, бо пакуль яны будуць відавочны, датуль раб спакойна жыць ня можа.

Жаролы беларускай культуры, яе багацьце і самастойнае значэньне між культурамі расейскай і польскай, найлепш паказвае наша гісторыя. Вось-жа дзеля апраўданьня культурнай асыміляцыі Беларусаў, неабходна беларускую гісторыю зьнішчыць, інакш з яе можна будзе заўсёды даведацца аб паходжаньні і ролі беларускасьці. З гэтай мэтай паны і іхнія беларускія рабы з асаблівай энэргіяй стараюцца вычыркнуць Беларусаў з гісторыі. З усёй пэўнасьцю можна казаць, што беларуская гісторыя адчула наймацней разбураючую руку рабоў-Беларусаў. У сваей разбураючай працы рабы карыстаюцца аружжам, выдуманым панамі. Гэтак рабы расейскага пана паўтараюць за ім, што ніякага беларускага народу няма і ня было, быў і ёсьць «единый русскій народ», складовай часткай якога зьяўляюцца між іншымі і Беларусы. Ніякай апрычонай гісторыі Беларусы ня мелі, была толькі гісторыя «общеруская». З гэтай мэтай расейскі пан папросту ўкраў багатую беларускую і ўкраінскую гісторыю і далучыў яе да маскоўскай. Менш аб тое, што з гэтага мэханічнага злучэньня нічога ня выходзе і што нават да апошніх часоў расейскія гісторыкі ня могуць выпрацаваць сынтэтычных асноў гэтай «общерусской» гісторыі, інакш даказаць арганічную цэласьць яе. Рабом гэта не патрэбна. Для іх хопіць бязмыснага паўтараньня за панам, што сталіцамі Расеі былі Ноўгарад, Кіеў, Уладзімір на Клязьме, Масква, Пецярбург, што Полацак, Менск, Смаленск, Пскоў і іншыя беларускія цэнтры былі толькі «общерусскімі удзеламі». Гэты мэханічны зьбіцень чужых гісторыяў імпануе Беларусам з рабскімі прэдыспозыцыямі. Хіба праўдзівыя «слёзы умиленія» выклікала ў іх заява расейскага цара на эміграцыі Уладзіміра Кірылавіча, які, запярэчыўшы магчымасьці каранаваньня яго на асобнага ўкраінскага цара, сказаў, што хто-б дапушчаў гэта, той: «совершенно не зналбы исторіи императорской Россіи. Вѣдь Кіев — это колыбель Россіи».

Рабы польскай культуры карыстаюцца так-жа дадзеным ім у рукі аружжам. Тут гаворыцца, што Вялікае Княства Бел.-Літ. было натолькі агорнута польскай культурай, што лічылася ня больш, як польскай правінцыяй. Міцкевіч, Сыракомля,

Касьцюшка, Крашэўскіназаўсёды злучылі землі Вял. Княства з Польшчай. Толькі польскі дух быў тут творчым і рабіў гісторыю. Усё, што ў яго рамы не ўкладалася, — было ўсходам, барбарствам, нягістарычным.

З гэткім аружжам нашыя рабы чужых культур стараюцца, хоць і дарэмна, збурыць собскую гісторыю, зацёрці сьляды свайго паходжаньня... А гэта мела-б для іх колёсальнае значэньне. Тады яны з ўсей пэўнасьцю маглі-б гаварыць, што беларускі рух гэта нешта новае, сэзоновае, нягістарычнае, а ў найгоршым прыпадку выдуманы варожымі агентурамі. Сумленьне рабоў у гэткім прыпадку было-б чыстае.

Рабы працуюць для чужой культуры з поўнай адданасьцю і сэнтымэнтам. Характэрна, што для беларускай культуры яны ня маюць ня толькі ніякае спагаднасьці, але прагавіта жадаюць ейнай сьмерці. Можа іх узварушыць загуба — скажам — мэксыканскай, абісынскай культур, але ніколі беларускай. Трагедыя апошняе можа выклікаць у іх толькі ціхую радасьць. Адданасьць у працы для чужой культуры, спатыканая ў рабоў, ёсьць зразумелай з вышэйшых разважаньняў. Але скуль бярэцца тут пачуцьцё, сэнтымэнт да яе?

Рабы-інтэлігенты, з беларускага сялянства або мяшчанства, стыкаюцца з чужой панскай культурай у романтычным апрацаваньні. Романтызм, «багацьце», «шляхэтнасьць» польскае культурнае творчасьці выдаецца ім натолькі захопліваючымі і натолькі проціЛежнымі да ўбогасьці собскага культурнага асяродзьдзя, што безапэляцыйна дэцыдуюць аб іхняй культурнай душы, будзяць у ёй сэнтымэнт да сябе. «Бедная» беларуская сялянска-мяшчанская культура выдаецца ім простай, грубой і гэтым самым няздольнай выклікаць і адрабіны таго пачуцьця, якое рабы маюць да чужой. Гэта некарыснае параўнаньне забірае ў іх далейшую цікавасьць да здабыткаў беларускіх культурнікаў. Змаганьне беларускіх культурнікаў з чужымі культурамі, прыняўшае апошнімі часамі шырокі размах, будзіць у іх душах нясмак да беларускасьці і яшчэ большы сэнтымэнт да чужыншчыны, з якой зрасьліся.

Мы стараліся паказаць прычыны паўстаньня і практычную дзейнасьць беларускіх рабоў. А якой мае быць ацэна гэтага зьявішча?

Тут шмат гаварыць ня прыдзецца. Культурныя рабы — гэта іменна і ёсьць той «гной», на якім мае буйна ўзрасьці на беларускай ніве чужая культура. Усе імкненьні чужынцаў да культурнае асыміляцыі Беларусаў асноўваюцца іменна на дапушчэньні існаваньня гэтага «гною» — рабства ў асымiляваным асяродзьдзі. Асымілятары аблічаюць, што гэтыя рабы знайдуцца, ідзе ім толькі аб тое, каб было іх як найбольш. Існаваньне гэтага «гною» ў значнай ступені апраўдвае нават прымусовую «культурную» асыміляцыю ў вачох ейных праваднікоў. А праз «нявінную» культурную асыміляцыю вядзец-

ца ўжо лягчэй і палітычная, што зусім зразумела. Грамадзянства, асыміляванае палітычна і культурна, ня ёсьць жывым. Да гэтага імкнуцца чужыя культурныя асымілятары, або, як іх называюць часьцей, «культуртрэгеры» ў адносінах і да Беларусаў.

Гэткім парадкам, ведаючы, што асыміляцыі паддаюцца людзі з рабскімі склоннасьцямі, што існаваньне рабства ў грамадзянстве зьяўляецца моцна небясьпечным, бо рабы — гэта першыя праваднікі чужой культуры ў сваім асяродзьдзі, а тым самым і першыя ворагі гэтага асяродзьдзя, усёроўна — сьведамыя ці нясьведамыя, — разгляданая тэма заслугоўвае на пільную ўвагу грамадзянства. Культурнае рабства — гэта хвароба ў грамадзкім арганізьме, з якой неабходна змагацца.

У канцы, — каб ня было памылак,—хочам падчыркнуць, што да культурных рабоў, само сабой разумеецца, ня можна аднесьці тых Беларусаў, якія, хоць і ўзгадоўваліся ў чужой— расейскай або польскай—культуры, але асталіся *думаючымі пабеларуску.* Гэтыя Беларусы нічога супольнага з рабамі ў разгледжаным сэнсе ня маюць, бо культурны раб паводле пададзенага тут азначэньня — гэта адзінка сьляпая, думаючая крытэрыямі свайго пана.

Новыя гарманізацыі беларускіх песьняў у выкананьні хору Р. Шырмы

Учасьце хору Р. Шырмы ў апошнім (сьнежань, 1938) канцэртным выступленьні, разам з М. Забэйдай-Суміцкім, трэба адзначыць з асаблівай увагай. А гэта—ня толькі за мастацкае выкананьне беларускіх песьняў, але — і за харавую праграму канцэрту. Ня гледзячы на тое, што ў праграме фігуравалі толькі два імёны, яна адзначалася нязвычайным багацьцем і хараством музыкальнага зьместу. Ясна, што для вытлумачэньня гэтага трэба зьвярнуцца да гэтых двух імёнаў, тых двух кампазытараў, якія далі новыя гарманізацыі беларускіх песьняў.

Мы ўжо неаднойчы пісалі ў нашым часапісе аб тым, колькі прыкладае працы Р. Шырма да таго, каб зьвярнуць увагу найлепшых славянскіх мастакоў музычнага творства на скарбы песьнятворчай душы нашага народу. Мы казалі аб тым, як праз Р. Шырму горача зацікавіўся, каб не сказаць — папросту закахаўся, — у беларускай красуні-песьні такі вялікі тварэцмузыкант, як А. Ц. Грэчанінаў (Расеец), даўшы ўжо чарод цудоўных харавых апрацовак нашых песьняў, што адзначаюцца высокай мастацкай прасьцінёй і празрыстасьцяй стылю. А. Ц. Грэ-

чанінаў усьцяж працуе над беларускай песьняй, карыстаючы зь яе багацьця і для ўласнага свабоднага мастацкага творства. Але Р. Шырма ня сьпіць. Ён шукае далей і далей. Апошнім часам яму ўдалося стварыць няменш шчасьлівае і плоднае „кон-геніяльнае" спатканьне беларускай песеннай душы з духам высокай музыкальнай культуры — у асобах двух украінскіх кампазытараў, якія жывуць у Амэрыцы. Гэта — Кошыц і Гайворонській.

У нашым артыкуле мы хочам бліжэй прыгледзіцца да таго творства абодвух мастакоў, якое было паказана на канцэрце хорам Р. Шырмы.

Наўперад — надзвычайна характэрна, што ў нашыя часы, калі блізу ўсе народы ня толькі малыя, але й вялікія, неяк замыкаюцца ў сваім нацыянальным сьвеце, абмяжоўваючыся ў вузкай яго сфэры, укладаючы ўсе найлепшыя сілы ў працу над уздымам і разьвіцьцём уласнага духовага жыцьця, абодва Украінцы, падобна вялікаму кампазытару Грэчанінаву, раскрылі шырака сваю творчую душу і для беларускай песьні, аддаючы на служэньне яе харастру свой час і сілы свайго выдатнага таленту.

Што перад намі тут зьявішча нейкага сьвятарнага „таінства", шлюбу як быццам самога музыкальнага Эроса з песеннай Псыхеяй нашага народу, відаць з таго, з якім блізу рэлігійным піетызмам адносіцца, прыкладам, Кошыц да сваей працы над беларускай песьняй. У адным з сваіх лістоў да Шырмы ён піша, што адной беларускай калядкай ён „хварэў" аж тры месяцы, носячы яе, як дзіцё, пад сэрцам, пакуль урэшце не „спарадзіў" у сьвет да новага мастацкага жыцьця... Што-ж дзіўнага, што такі падыход да працы, такі рэлігійны настрой мастака, такое высокае ўзрушаньне яго душы ў творстве — спараджаюць, праўда, з поўнацэннага, вялізарнай красы, „сырца" народнай песьні — творы вынятковай мастацкай сілы, хараства і цэннасьці!

З выкананай на канцэрце праграмы найбольш выдатнымі і значнымі былі дзьве песьні, апрацаваныя Кошыцам: калядка — „*Там за садам*" і валачобная — „*Лугам зеляненькім*". Геніяльная ў сваей прасьціні і шчырасьці народная калядка ўзьведзена мастаком у „пэрлу стварэньня", як любіў выражацца Гогаль. Песьня адразу прыкоўвае ўвагу, захоплівае красой і сьвежасьцю свайго мэлёсу. Але толькі бліжэйшы разгляд, паўторнае выкананьне дый параўнаньне з пачатным „сырцом" даюць магчымасьць ацаніць усю мастацкую тонкасьць і цэннасьць уложанае ў яе апрацоўку творчае працы ці вярней „кангеніяльнага" творства. Каля дзесятка вар'янтаў асноўнага матыву песьні зусім не зьяўляюцца „вольнай фантазыяй" ці, як кажуць, „варыяцыямі" на заданую тэму. Не, — кожны вар'янт органічна зьвязаны з далейшым слоўным тэкстам песьні, памастацку ілюструючы

зьмест кожнай яе строфы. Слоўны тэкст і сплеценая з ім у адну жывую істоту музыка жывуць і зьмяняюцца разам. Творчая інтуіцыя мастака-кампазытара ў гэтай апрацоўцы беларускай песьні — папросту зьдзіўляючая. Асабліва-ж — канец песьні з яго вясельным матывам, такім папулярным у нашай вёсцы, які так памастацку завяршае калядку!

Такой-жа пэрлай мастацкай сынтэзы тэксту песьні і музыкі зьяўляецца і другая вялікшая з выкананых гарманізацыяў — „Лугам зяляненькім". І тутака таксама — кожны куплет не зьяўляецца простым паўтарэньнем аснаўнога матыву, але яго самастойнай перапрацоўкай — згодна з далейшым слоўным цячэньнем песьні. Кожны куплет — індывідуальнае, жывое зьвяно суцэльнага ланцуга. Выступленьне паасобных галасоў і іх спалучэньне і тут органічна зьвязана з тэкстам. Канчаецца гэтая вялікодная песьня валачобнікаў (якой нямашака ў іншых народаў сьвету) — урачыстым царкоўным харалам, замыкаючым надзвычай удачна мастацкую цэласьць песьні.

Ясна, што мы маем перад сабой нешта значна большае, як простую гарманізацыю. Гэта — запраўднае творства мастака на аснове народнага песеннага „сырцу". З аднаго боку, толькі на „аснове" гэтай вякамі вынашанай народам і спароджанай з Божага насеньня песьні можа мастак дасягнуць гэтай вышыні ў сваім творстве, а з другога боку — сама песьня можа раскрыць усё сваё багацьце, усё хараство творчае душы народу — толькі тады, калі яе „падыме" на новую вышыню новы творчы „дух" вольнага мастака, за якім стаіць веда і штука тысячалецьцяў музычнай культуры... Такую сынтэзу „народнае душы" і „мастацкага духа" — і даюць нам цудоўныя творы Кошыца.

Няменш цікавае і цэннае творства Гайворонськага. Апроч раду гарманізацыяў, якія таксама адзначаюцца мастацкай фактурай, выканана была хорам уласная кампазыцыя Гайворонськага — яго музыкальны абраз *„Спакойна дрэмлець Нарач"* — на словы паэта Максіма Танка. Абраз захоплівае сьвежасьцю і сілай малюнку. Але — ізноў — трэба добра ўчытацца ў тэкст, дый адначасна ўслухацца ў яго вокальную ілюстрацыю, каб цалком ацаніць сынтэтычную мастацка-жывапісную яркасьць, точнасьць і гармонію ўсяго паэтыцка-музычнага абразу. Але апроч вонкавай, так сказаць, красы, абраз Нарачы мае, як і самы верш Танка, характэрны ўнутраны сымбалізм, які надзвычай выразна выяўляе і падчырківае музыка Гайворонськага.

Ул. Чэмер

Два канцэрты хору Рыгора Шырмы

У сакавіку двойчы выступаў на канцэртнай эстрадзе ў Вільні ведамы Рыгор Шырма з сваім хорам. Першы канцэрт хору Беларускага Студэнцкага Саюзу адбыўся ў залі Сьнядэцкіх У.С.Б. 3 сакавіка, другі — пашыранага хору Катэдральнага Сабору — у залі Кансэрваторыі 9 сакавіка. Праграма першага канцэрту зьмяшчала выключна гарманізаваную беларускую народную песьню, якая зьяўляецца, як ведама, — ня толькі „жалезным рэпэртуарам", але можна сказаць — *залатою валютай* хору Шырмы. Мы няраз пісалі аб тым, якія выдатныя сілы музыкальнага сьвету зацікавіліся беларускай красуняй песьняй дый аддаюць на мастацкае выяўленьне і падвышэньне яе прыроднай красы сваю высокую музыкальную культуру і свае таленты. Блізу ўсе гэтыя найвыдатнейшыя творцы былі прадстаўлены ў праграме канцэрту: Галкоўскі, Гайворонській, Грэчанінаў, Евец, Кошыц, Рагоўскі, Сьвешнікаў, Уладзімірскі.

Аб працах нова-зацікавіўшыхся беларускай песьняй, праф Кошыца і Гайворонськага, мы казалі вышэй. Тутака адзначым толькі, што блізу ўсе нумары з іхнім імем упяршыню выканаsны былі хорам з новай партыі, толькі што атрыманай Р. Шырмам ад высокіх амэрыканскіх мастакоў. Асабліва трэба адзначыць музыку Гайворонськага на сільны верш Танка — „Прайдуць гады", як адзіны вынятак з усей чыста народнай праграмы. Адзначым яшчэ працы маладога беларускага кампазытара Еўца, які падае добрыя надзеі. Адзначым яшчэ, што асаблівую ўвагу зьвяртаюць мастакі-гарманізатары на *валачобныя песьні* Беларуса, якія, як ведама, зьяўляюцца выключнай уласнасьцяй, манаполям, ці *рэгаліяй* нашага Народу. І гэта правільна, бо-ж гэтыя песьні адзначаюцца характэрным рытмічным складам, даючым, аднак, шмат вар'янтаў, што, у злучэньні з іх першароднай красой, можа зрабіць валачобную песьню, так сказаць, „авангардам" у тым паходзе на падбой сьвету, які бязспрэчна пачала ўжо беларуская музыка ў нашыя часы. Шырма даў аж тры валачобныя песьні ў сваей праграме ў апрацоўцы Кошыца і Гайворонськага і ўсе яны, гэтыя песьні. як розныя кветкі, розьняцца паміж сабою, захоўваючы нейкую лучнасьць у рытме.

Выкананьне праграмы, як заўсёды, было мастацкае, сагрэтае шчырай беларускай душой — і хору і яго дырыгента. Ці трэба казаць, што сугучча, якое стала лучыць беларускі хор Шырмы з яго аўдыторыяй, пераважна таксама беларускай па сваім складзе, і на гэты раз выклікала водгукі бурнага захапленьня з боку апошняй. Трэба адзначыць, што канцэрт хору быў прысьвечаны 15-лецьцю працы Рыгора Шырмы на ніве беларускага музычна-вокальнага мастацтва. Таму воплескі аўдыторыі прынялі характар бурнай авацыі ў чэсьць паважанага Юбіляра. Юбіляру былі паднесены ня толькі кветкі, але й прыгожа вы-

шытыя ручнікі — ад моладзі, якая хіба-ж найбольш цэніць душой яго ахвярную мастацкую працу.

Зусім іншы характар меў другі канцэрт — пашыранага хору Шырмы — у залі віленскай Кансэрваторыі. Праграма яго складалася выключна з твораў праваслаўнай духоўнай музыкі, пераважна кампазытараў кіеўскай школы. Галоўныя імёны праграмы — Вэдэль, найстарэйшы, Кошыц, сучасны, і Стэцэнко.

Стэцэнко — кампазытар новы. Ён памёр у 1927 г., маючы 35 гадоў — у Кіеве ад тыфусу. Стэцэнко — вучань Кошыца, і Кошыц, пасылаючы яго творы, нідзе яшчэ недрукаваныя, Шырме, піша аб яго працы з найвялікшым захапленьнем. Творчасьць самога Кошыца ў галіне царкоўнай музыкі адзначаецца тэй самай яснасьцяй і празрыстасьцяй фактуры, сілай і шчырасьцю выяўленьня творчай душы, як і ў галіне музыкі сьвецкай. Вэдэль, як сказана, стары кампазытар, яшчэ з часоў Паўла I. Яго лёс быў страшэнна цяжкі, — скончыў Вэдэль жыцьцё ў вастрозе, ад чорнае мэлянхоліі, як „палітычны вязень“... Блізу геніяльны музыкант, Вэдэль, выкліканы з Кіева ў Маскву, тутака — на чужыне — перажыў востры духовы крызыс, кінуў сьвет і пайшоў манахам-песьняром-прапаведнікам „ у народ“, папераджаючы ў гэтым расейскіх „народнікаў“. Абарванцам, „брадзягай“ хадзіў ён па вёсках, пяяў свае натхнёныя духойныя творы — ня ў панскіх залях, але ў сялянскіх хатах прыгоннага хлебароба... Ясна-ж, такой культурнай работы „не маглі“ знасіць абшарнікі, і ўрэшце.. Вэдэль быў абвінавачаны ў „камунізьме“ дый папаў, па загаду самога цара, у турму... Мастак, якога насілі-б на руках у кожным краі, якога народ шануе і цэніць свае духовыя вартасьці, зьгінуў, але творы яго захаваліся— ў тысячах рукапісах. Кошыц сам перагледзіў гэтую цэнную спадчыну, перарэдагаваў яе, на падставе дасягненьняў сучаснай мастацкай тэхнікі, і найлепшыя рэчы прыслаў Шырме. Творы Вэдэля робяць найвялікшае ўражаньне. Гэта адчула і аўдыторыя на канцэрце Шырмы. Беларуская мастацкая духоўная музыка была прадстаўлена беларускай народнай калядкай, старанна згарманізаванай праф. Галкоўскім.

На канцэрце было найбольш беларускай моладзі, але была і расейская, а нават — і польская, каталіцкая. Бо-ж ведама, праваслаўная царкоўная музыка мае сусьветную славу. Было шмат праваслаўнага духавенства.

Хору і яго мастаку-рэгенту, Юбіляру, рабілі бязупынныя авацыі.

Ул. Чэмер

Людвік Абрамовіч

(Замест хаўтурнае прамовы)

9 сакавіка с. г. памёр на 60-ым годзе жыцьця ведамы ў шырокіх колах беларускага грамадзянства рэдактар польскага часапісу „Przegląd Wileński", Людвік Абрамовіч.

Побач з нячысьленай групай польскіх дэмакратаў, побач з прадстаўнікамі Літвіноў, праводзілі нябожчыка на месца вечнага адпачынку на Росе прадстаўнікі ўсяго беларускага грамадзянства — бяз розьніцы груп і кірункаў. Бо-ж сьв. п. Людвік Абрамовіч пакінуў сярод Беларусаў добрую памяць аб сабе.

Абрамовіч — віленскі старажыл. Як публіцыст, ведамы ўжо ад 1906 году, калі пачаў супрацоўнічаць у польскай дэмакратычнай газэце „Gazeta Wileńska". Гарачы польскі патрыёт, ён лятуцеў аб ускрашэньні Польшчы і змагаўся, як мог, за правы польскага народу пад уладай Расеі. Але адначасна пачуваў сябе грамадзянінам і нашага краю, думаў аб ускрашэньні колішняга Вялікага Княства Літоўскага, аб'яднанага фэдэрацыйнымі сувязямі з Польшчай, і культурнай мінуўшчыне гэтага краю прысьвяціў дзьве навукова-дасьледчыя працы.*) З поўнай пашанай адносіўся да адраджэнска-вызвольных імкненьняў Беларусаў і Літвіноў, хоць і з аднымі і з другімі разыходзіўся ў палітычных ідэалах.

У тыя далёкія перадваенныя часы дэмакраты ўсіх нацыянальнасьцяў Расеі мелі шмат супольнага. Злучала іх перад усім супольная ідэолёгія і неабходнасьць змагацца з супольным ворагам — царскай уладай, каторая роўна няволіла і так званых „інародцаў" і народ расейскі. Усе імкнуліся да волі, усе бачылі ў другіх нацыянальнасьцях натуральных саюзьнікаў, усе мелі супольны язык. Лёгка тады было згаварыцца з усімі і польскім дэмакратам, а на землях беларуска-літоўскіх яны ў пэўныя мамэнты нават маглі супрацоўнічаць і з Беларусамі і з Літвінамі.

Пасьля ўскрашэньня Польшчы гэтае супрацоўніцтва спынілася, гэты супольны язык — счэз. Паміж „пануючай нацыяй", нават паміж яе дэмакратычнымі групамі з аднаго боку і нацыянальнымі „меншасьцямі" з другога стварылася непераступная прорва. І толькі рэдкія адзінкі спасярод даваеннае польскае краёвае дэмакратычнае інтэлігенцыі захавалі старыя сувязі з Беларусамі і Літвінамі, зьберагглі і колішні супольны язык з імі. Да гэткіх адзінак, лічба каторых з году ў год усьцяж безпаваротна зьмяншаецца, належыў і Людвік Абрамовіч.

*) „Problem Litwy podczas wojny światowej. Zbiór dokumentów, uchwał, odezw i t. p." i „Cztery wieki drukarstwa w Wilnie (1525—1925)".

У даваенныя часы на грунце разыходжаньня ў палітычных ідэалах паміж Абрамовічам і Беларусамі ўзьнімаліся і спрэчкі, і сваркі — нават даволі вострыя. Але было гэта тады, калі ўсе споркі аставаліся йшчэ ў сфэры тэорэтычных разважаньняў, калі словы йшчэ не ператвараліся ў дзела. Зьбліжэньне паміж Абрамовічам і Беларусамі адбылося шмат пазьней — ужо пасьля ўскрашэньня Польшчы, калі ўчарашнія лятуценьнікі пачалі рэалізаваць свае тэорыі ў жыцьці. І як-жа далёка адыйшліся яны ад вызнаваных перад вайной ідэалаў!..

Людвік Абрамовіч захаваў поўнасьцю старыя свае ідэалы. Ня мог маўчаць аб тым, што выклікала ў яго боль і патрэбу пратэсту. Узнавіўшы выдаваны йшчэ перад вайной часапіс свой „Przegląd Wileński", ён з вялікай грамадзкай адвагай выступіў на абарону інтарэсаў беларускае й літоўскае „меншасьцяў" у Польшчы, каторыя на сваей зямлі складаюць большасьць. Ён голасна трэбаваў пашаны для нашых нацыянальных правоў, трэбаваў здаваленьня эканамічнагаспадарчых патрэбаў нашага краю і інтарэсаў працоўных масаў гэтага краю. Блізка супрацоўнічаў ідэйна з ведамым віленскім грамадзкім дзеячом адвакатам Тадэушам Врублеўскім, каторы шчыра бараніў правы Беларусаў і Літвіноў ды называў сябе „грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага"; пад уплывам апошняга верыў, як і Врублеўскі, што цэнная рэч — бацькаўшчына, але яшчэ больш цэнная — *воля,* воля для ўсіх грамадзян бяз розьніцы нацыі і веры. Часапіс „Przegląd Wileński" ў працягу цэлага раду апошніх гадоў быў адзінай трыбунай, з якое самі Беларусы маглі прамаўляць да польскага грамадзянства, інфармуючы яго аб сваіх патрэбах і балячках. Праўда, ня ўсё даходзіла да тых, для каго пісалася: за апошнія два гады часапіс Абрамовіча быў сыстэматычна канфіскаваны і паасобныя нумары траплялі да рук чытачоў часта праз некалькі месяцаў пасьля свайго выхаду, калі суд здымаў канфіскату.

У 1936 годзе Абрамовіч спраўляў 30-летні юбілей сваей публіцыстычнай працы. Пасьля публічнага абходу, на каторым гаварыліся шчырыя дый няшчырыя прамовы аб заслугах Абрамовіча для нашага краю, юбіляр папрасіў да сябе на вячэру некалькі бліжэйшых ідэйна асоб — пару Беларусаў, пару Літвіноў і некалькі Палякоў. І тут былі прамовы—толькі ўжо бязспрэчна зусім шчырыя. Прамовіў і сам юбіляр. Гаворачы аб працы ўсяго свайго жыцьця, ён адзначыў, што ў даваенныя часы — часы няволі для Палякоў — ён горача бараніў правы польскага народу і тады пападаў у канфлікты з другімі народамі нашага краю. Шмат хто меў тады падставу крытыкаваць ягонае становішча. Але пасьля ўскрашэньня Польшчы ён лічыць справядлівым, каб „меншасьці" ў Польшчы карысталіся такой самай воляй, якой трэбавалі Палякі для

сябе ад Расеі. У Польшчы ён мусіў выступіць на змаганьне з польскім нацыяналізмам — у імя сваіх старых дэмакратычных і гуманітарных ідэалаў.

Гэтая „споведзь жыцьця" Абрамовіча канчаткова пагадзіла яго з тымі Беларусамі, каторыя з даваенных часоў маглі захаваць у сэрцы нейкі жаль да яго — за мінулае.

Незадоўга да сьмерці сваей Людвік Абрамовіч, зламаны цяжкой хваробай і маральна прыгнечаны бязупыннымі канфіскатамі „Przegl. Wil.," зачыніў свой часапіс. А праз паўгоду — памёр і сам, як быццам сьцьвярджаючы, што ня бачыць карысьці ад сваей працы, што барацьба яго ў сучасных абставінах дарэмная...

Прадстаўнікі беларускага грамадзянства, каторыя аддавалі на Росе апошнюю паслугу нябожчыку, з глыбокім жалем і пашанай скланялі галовы над сьвежай магілай гэтага шляхотнага ідэаліста і барацьбіта за *адну* праўду і *адну* волю для ўсіх.

Хай-жа лёгкай будзе Яму наша зямелька, каторай ён — хоць на свой асаблівы спосаб — шчыра служыў!

Вільня. 11.III.39. *А. Луцкевіч*

Адвард Самуйлёнак

12 лютага 1939 году пасьля доўгай і цяжкой хваробы памёр ад сухотаў малады і вельмі таленавіты пісьменьнік Савецкай Беларусі Адвард Людвігавіч Самуйлёнак.

Пісьменьнік нарадзіўся ў 1907 годзе 23 ліпня ў Пецярбурзе, у сям'і чорнарабочага. Бацька яго паходзіў з сялянскай сям'і, заўсёды пражываючай у вёсцы Бандзелі, Дрысенскага раёну, які граічыцца з Браслаўскім і Дзісенскім паветамі.

Дзіцячыя гады Адвард правёў у горадзе, але ў часе расейскай рэвалюцыі разам з бацькамі пераехаў у родную Дрысеншчыну, дзе прыходзілася цяжка зарабляць на кавалак хлеба. Па вайне і рэвалюцыі Адвард хадзіў у школу, па скончэньні якой, выявіўшы пісьменьніцкія здольнасьці, быў запрошаны на сталую працу ў рэдакцыю часапісу „Чырвоная Полаччына" ў Полацку. Працаваў тут Адвард да 1934 г. У гэтым-жа годзе пераяжджае ў Менск, дзе поўнасьцю пасьвячаецца літаратурнай дзейнасьці аж да апошніх дзён свайго жыцьця.

Апрача дробных вершаў, паэм, навэль і апавяданьняў, друкаваных у „Чырвонай Полаччыне" і інш. часапісах, напісаў Адвард вялікшыя наступныя творы: „Насустрач будучыні" (аповесьць), „Цагліна каземата", „Русальчыны сьцежкі", „Тэорыя Кэленбрун" (аповесьць), „Пажар павуціньня" (трылёгія, асталася ў рукапісе), „Пункт апоры", „Будучыня" (раман), „Сяржант Дроб", „Дачка эскадрона" (зборнік апавяданьняў) і „Пагібель ваўка" (п'еса). Гэты апошні твор закончыў пісаць пісьменьнік ужо зусім будучы хворым, у апошніх днях свайго жыцьця.

Савецкія крытыкі ставяць Самуйлёнка ў рады найлепшых пісьменьнікаў Савецкага Саюзу. *П. М.*

Кнігапіс

Ad. Stankievič: **„Biełaruski Chryścijanski Ruch“**, Вільня, 1939. Бач. 272 Фармат 8⁰. Выданьне „Chryścijanskaje Dumki“.

Скромная беларуская літаратура аб беларускім грамадзка-палітычным руху ўзбагацілася паважнай пазыцыяй — чарговай працай кс. Адама Станкевіча п. з. „Biełaruski Chryścijanski Ruch“, якая выйшла з друку ў канцы мінулага году, некалькі дзён перад высяленьнем паважанага аўтара. Кніжка дае яркі і рачовы, апёрты на фактычным гістарычным матарыяле, абраз беларускага хрысьціянскага грамадзка-палітычнага руху, так незарганізаванага, як і зарганізаванага. Выпаўняе яна дзеля гэтага вялікую нястачу ў беларускай гісторыяграфіі і публіцыстыцы, гдзе не знаходзім патрэбнага і об'ектыўнага асьвятленьня беларускіх хрысьціянскіх грамадзка-палітычных мамэнтаў і іх ролі ў беларускай гісторыі агулам, а ў адраджэньні беларускага народу ў асобнасьці.

Кніжка падзелена на адзінаццаць разьдзелаў. У першым з іх аўтар, гаворачы аб вытоках беларускага нацыянальнага адраджэньня, спачатку коратка і агульна схарактарызаваў беларускую старасьвецкую культуру, якая да XIV стагодзьдзя мела ўсходне-візантыйскі характар, а ад гэтага часу — ад часу злучэньня Беларусі з Літвой — „пачала набіраць адзнакаў хрысьціянска-заходніцкіх, каталіцкіх“ (бач. 1) і далей схарактарызаваўшы агульнае палажэньне беларускага народу ў пару яго палітычнага і культурнага заняпаду (ад канца XVII ст. да пачатку XIX), а так-жа навуковы і палітычны рух у Польшчы і яго заінтэрэсаваньні мінуўшчынай Беларусі ў пачатку XIX ст., — шырэй спыніўся на першых падсьведамых пачынальніках беларускага культурнага адраджэньньня з XIX ст. Тут аўтар падае цэлы чарод прадстаўнікоў каталіцкага духавенства — лацінскага і ўсходняга абрадаў, — беларуска-польскіх рамантыкаў, а так-жа дасьледчыкаў Беларусі з боку Расейцаў і праваслаўных абрусеўшых Беларусаў. Усе яны так ці йнакш, — ці то сваей грамадзкай працай, ці літаратурна-культурнай, ці навуковай — сталіся падсьведамымі пачынальнікамі беларускага культурнага адраджэньня. А дзеля таго, што з іх гэта былі пераважна каталікі, а зародкі беларускага культурнага адраджэньня далі вылучна каталікі, — аўтар здаецца моцна абгрунтаваў свой і іншых беларускіх дасьледчыкаў (праф. Ігнатоўскі, А. Цьвікевіч) пагляд, што беларускае адраджэньне выводзіцца ад Беларусаў каталікоў. У наступным разьдзеле аўтар затрымліваецца на пачатках сьведамага беларускага нацыянальнага руху, прадстаўляючы ў ім ролю Беларусаў каталікоў (1900—1910 г.). Пачаткі гэтага руху выводзяцца ад Фр. Багушэвіча. Творчасьць гэтага пісьменьніка,

ейны ідэйны зьмест, сталася ідэолёгічнай асновай гэтага сьведамага беларускага нацыянальнага руху.

У гэтым руху бяруць актыўны ўдзел беларускія літаратары, культурна-нацыянальныя і грамадзкія дзеячы. Многія з іх — гэта Беларусы каталікі — сьвецкія і духоўнікі. У трэцім разьдзеле аўтар дае разгляд беларускага і каталіцкага арганізаванага руху. Тут падрабней разглядае дзейнасьць гуртка Беларускай Моладзі „Chatka“ ў Горадні, Беларускага Гуртка ў Віленскай Духоўнай Каталіцкай Сэмінарыі, а так-жа Гуртка ў Духоўнай Каталіцкай Акадэміі ў Пецярбурзе. У наступных двух разьдзелах цікава прадстаўлена праца Беларусаў каталікоў пад нямецкай акупацыяй, асабліва роля беларускага каталіцкага духавенства, а так-жа народная праца Беларусаў каталікоў пры канцы расейскага царызму і на пачатку рэвалюцыі.

Далейшыя разьдзелы прысьвечаны даволі абшырнаму разгляду беларускага хрысьціянскага арганізаванага руху ад 1915 да 1935 г. Гэты рух выступаў спачатку пад відам Беларускай Дэмакратычнай Злучнасьці, пазьней — пад відам Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі, якая ў 1935 г. ператварылася ў арганізацыю Беларускае Народнае Аб'яднаньне. На працягу 20 ці гадоў свайго існаваньня гэты беларускі хрысьціянскі арганізаваны рух адбыў цікавую ідэовую эвалюцыю. Паступова ён пераходзіў з прынцыпу конфэсыйнага, каталіцкага, на грунт шырэйшы, каб злучыць на сваіх хрысьціянскіх асновах Беларусаў і каталікоў і праваслаўных. У пытаньнях грамадзка-эканамічных ідэйныя асновы руху набіралі характару радыкальнага. Палітычная праграма амаль ад самага пачатку апёрлася на моцныя беларускія незалежніцкія ідэалы. Гэты рух цікава прадстаўляецца на грунце агульных палітычных умоў грамадзка-палітычнага жыцьця у краі, а так-жа на грунце адносінаў яго да іншых беларускіх грамадзкіх кірункаў.

Сам аўтар, бяручы дзейнае і кіруючае ўчасьце ў беларускім хрысьціянскім руху ад 1910 г., і знаючы яго добра, прадставіў гэты рух у апошніх дзесятках гадоў найбольш поўна. Чытач у пяршыню даведваецца з кнігі аб многім цікавым фактычным матарыяле, які дагэтуль у беларускім друку ня быў яшчэ скарыстаны.

Заслугай аўтара ёсьць, што ён, як ужо сказана было напатку, запоўніў „пустое“ месца ў беларускай гісторыяграфіі, у гістарычным разьвіцьці беларускай грамадзкай думкі, прадставіўшы ў сваей кнізе гістарычны развой беларускай хрысьціяскай, у аспэкце каталіцкім, думкі.

Мае кніжка кс. Адама Станкевіча і тую дадатнюю асаблівасьць, што чытача ўзмацняе ў патрыётычным настроі і ў правільным беларускім палітычным накіраваньні...

Кніжка чытаецца з цікавасьцю, лёгка і жыва. Тэхнічна выдана добра. Надрукавана лацінкай.

Я. Ш.

Хроніка

— У Беларускім Навуковым Т-ве. 12 лютага адбыўся штогодні агульны сход сяброў Т-ва. Пасьля абшырнае справаздачы з працы Т-ва і ягоных сэкцыяў за 1938 год, сход даў Ураду абсолюторыю і выказаў яму падзяку за працу ў нязвычайна цяжкіх абставінах.

Дзеля таго, што поўнамоцтвы старога Ураду скончыліся, сход выбраў новы склад Ураду на наступныя тры гады. Выбраны: 1. д-р Б. Грабінскі, 2. інж. А. Трэпка (скарбнік), 3. А. Луцкевіч (старшыня), 4. д-р Я. Станкевіч, 5. мгр. М. Пяцюкевіч, 6. мгр. М. Шкялёнак (сэкратар). Апрача таго ў склад ураду ўваходзіць Ул. Самойла, як бібліятэкар. Кандыдаты: П. Сяргіевіч, В. Русачанка, В. Грышкевіч. У Рэвізыйную Камісію выбраны: 1. Ф. Стэцкевіч, 2. Сяргей Паўловіч, 3. Анастасія Гаўрылічанка. Кандыдаты: Рыгор Шырма і Аляксандар Уласаў.

З фінансавае справаздачы відаць, што ад мамэнту пазбаўленьня Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча дзяржаўнае дапамогі (у траўні месяцы 1938 году) на ўтрыманьне Музэю беларускае грамадзянства злажыла 1.058 зл. 50 гр. ахвяр і сталых складак. Трэба спадзявацца, што ў *1939* годзе зьбіраньне ахвяр на Музэй пойдзе лепей. Гэтак, у апошніх днях ад аднаго грам. К. Душэўскага з Коўна паступіла ў касу Т-ва на гэту мэту 430 злот. Прыклад гр. Душэўскага павінен заахвоціць і ўсіх іншых Беларусаў, каторыя маюць магчымасьць нешта даць з сваіх заробкаў на гэту важную культурную ўстанову.

— У Беларускім Музэі. За першыя месяцы 1939 году (студзень, люты, пачатак сакавіка) у Музэй паступілі ахвяры й дэпозыты рэчамі ад 16 асобаў. Сярод прысланых экспонатаў варта адзначыць дар гр. Ул. Пігулеўскага з Рыгі: 20 узораў (пад шклом) беларускіх паяскоў з Латгаліі. Шляхам замены павялічылася калекцыя старое зброі.

За мінулы 1938 год лічба дараў і дэпозытаў, атрыманых ад 52 асобаў, прадстаўляецца так: 331 манэта, 78 банкнотаў і 165 розных экспанатаў. Сярод апошніх—багатая зборка разьбы і цэнныя іконы. Узбагаціўся, таксама ў мінулым годзе, ня гледзячы на цяжкія фінансовыя варункі Бібліятэкі Нав. Т-ва, і кнігазбор апошняе. Усяго набыта Б-кай — шляхом куплі і ахвяры, збоку навукова-асьветных установаў, польскіх і загранічных, і прыватных асоб, — каля 250 выданьняў, сярод якіх ёсьць вельмі цэнныя і рэдкія.

— 13-га сакавіка адбыўся ў Вільні агульны гадавы сход сяброў Т-ва „Беларускае Каталіцкае Выдавецтва". Сход выслухаў справаздачу ўступаючага Ураду з дзейнасьці Т-ва за мінулы год, прыняў яе да ведама і выразіў ураду абсолюторыю з падзякай. Сход выразіў асобную падзяку выселеным адміністрацыйнымі ўладамі ў канцы мінулага году з прыгранічнай паласы (з Вільні): б. старшыні Т-ва — кс. Адаму Станкевічу, і сябру Т-ва — інж. А. Клімовічу, за іх заслугі і дзейнасьць на грунце беларускага каталіцкага выдавецтва. Сход выбраў новыя ўлады Т-ва. У склад новага ўраду ўваходзяць: мгр. Я. Шутовіч — старшыня, Ст. Станкевіч — віцэ-старшыня, А. Дасюкевіч—сэкратар, Я. Багдановіч—скарбнік, В. Чарнэцкая — вольны сябра. У Рэвізыйную Камісію выбраны: Я. Пазьняк—старшыня, А. Шутовіч і Фл. Будрэвіч — сябры.

— Юбілей „Шляху Моладзі". У сакавіку месяцы сёлета мінула дзесяць год ад выхаду першага нумару часапісу беларускай моладзі — „Шлях Моладзі". Свой юбілей рэдакцыя і выдавецтва часапісу адзначылі спэцыяльным, багата ілюстраваным, пабольшаным нумарам (налічае бачын 20, замест, як нармальна, 8), які выйшаў 25.III.

„Шлях Моладзі" мае вялікія заслугі ў беларускім нацыянальна-культурным жыцьці. Праз дзесяць год свайго існаваньня, ён радзіў у чытача пачуцьцё гарачага беларускага патрыётызму, шырыў здаровую нацыянальную думку і ў меру магчымасьці абслугоўваў беларускія

грамадзкія і нацыянальныя патрэбы.

Гожа адзначыць, што часапіс існуе дзякуючы ахвярнай, саматужніцкай працы яго рэдактароў, выдаўцоў і супрацоўнікаў, а так-жа дзякуючы ідэёвасьці Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны, якой уласьнікам зьяўляецца беларускі грамадзка-культурны дзеяч, шырока ведамы кс. Адам Станкевіч.

Шчыра вітаючы „Шлях Моладзі" з ягоным юбілеям, зычым яму далейшага памыснага разьвіцьця.

— Беларускае студэнцкае „Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы" віленскага ўнівэрсытэту зарганізавала курс беларусаведы. У першым квартале сёлета чыталі лекцыі: з бел. літаратуры — дыр. А. Луцкевіч, з гісторыі Беларусі — мгр. М. Шкялёнак, з гісторыі беларускага языка — др. Я. Станкевіч, з эканомікі і географіі Беларусі — др. В. Тумаш і студ. Т. Трафімучанка, з гісторыі культуры ў Беларусі (даклад аб рэвэляцыйных раскопках Замковай Гары ў Горадні, якія даказваюць існаваньне ў Горадні яшчэ ў 11—12 веку высокай беларускай культуры і існаваньне асобнага беларускага княства) — студ. Ст. Грынкевіч.

— У сакавіку месяцы студэнты Школы Палітычных Навук у Вільні зарганізавалі два вечары, прысьвечаныя беларускай літаратуры. Рэфэраты аб старой і новай беларускай літаратуры чыталі: дыр. А. Луцкевіч і мгр. Хв. Ільляшэвіч, а паэт Максім Танк дэклямаваў свае і іншых бел. паэтаў творы.

— Вінцук Адважны (кс. Я. Гэрмановіч), беларускі паэт і пісьменьнік, які ўлетку мін. году не па сваей волі пакінуў Вільню і праз некаторы час прабываў на Белянах пад Варшавай, а ад восені — ў Рыме, паводле нашых інфармацыяў, ў палавіне сакавіка выехаў з Рыму — праз Марсылію — у Манджурыю, у м. Харбін, дзе працуе беларуская місія а. а. Марыянаў, на чале з Яго Эксцэленцыяй а. др. Ф. Абрантовічам.

— 9 паштовак з беларускімі ткацкімі народнымі ўзорамі ў розных колерах выдалі друкарскім спосабам беларускія жанчыны. У гэтым ліку 4 паштоўкі маюць вялікодныя пісанкі—з тыміж ткацкімі народнымі ўзорамі (пояскоў). Паштоўкі каштуюць: 20 гр. штука. Галоўны склад, Бел. Кнігарня „Пагоня" — Вільня: Завальная 1.

— Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні не атрымаў ад унівэрсытэцкіх уладаў дазволу на зарганізаваньне 25.III.39 г. урачыстае акадэміі ў чэсьць 21-ых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

— Ад 29—31 студзеня ў Маскве адбыліся вечары, прысьвечаныя беларускай літаратуры. Жыхары Масквы праявілі вялікае зацікаўленьне да беларускай літаратуры і мастацтва.

Творы свае прачыталі ў Маскве: Янка Купала, Якуб Колас, П. Броўка, П. Глебка, К. Крапіва, А. Куляшоў, Э. Агняцьвет, а таксама маскоўскія паэты прачыталі творы беларускіх пісьменьнікаў у перакладзе на расейскую мову.

У канцэрце выступалі: народная артыстка БССР Александроўская, артыст Балоцін і кампазытар Шчэглоў, якія выканалі беларускія народныя песьні.

Усяго ў Маскве адбылося восем вечароў беларускай літаратуры, якія прадэманстравалі перад працоўнымі Масквы дасягненьні беларускай літаратуры і мастацтва.

— У студзені гэтага году бальшавіцкія ўлады ўручылі ордэны беларускім пісьменьнікам і паэтам: Купала і Колас атрымалі „ордэн Леніна", Зм. Бядуля, Міх. Лынькоў, Адвард Самуйлёнак „ордэн працоўнага чырвонага сьцягу, П. Броўка і П. Глебка атрымалі — „азнаку пашаны". Гэтая ўзнагарода паэтаў і пісьменьнікаў зусім нас ня цешыць, а наадварот — смуціць...

— Спэцыяльная камісія кіраўніцтва справамі мастацтваў пры СНК БССР прыступіла да прыйма абразоў і скульптураў для мастацкай галярэі БССР. Прынята ўжо частка абразоў і скульптураў з Менску ў ліку 500 экспонатаў. У лік іх уваходзяць работы Рэпіна, Серова, Макоўскага, Верашчагіна, Каровіна, Ярашэнкі, Бродзкага, Арлова, Клевера, Пэна, Волкава, Грубэ і інш.

Заходняэўропэйскія мастакі прадстаўлены копіямі абразоў Рэмбрандта і інш. мастакоў галяндскай шко-

лы, копіямі абразоў Рафаэля, радам абразоў мастакоў італіянскай школы XVII - XVIII стагодзьдзяў. Ёсьць узоры клясычнай скульптуры: Праксіцеля, Лізыпа, Скаполя і інш. Апрача экспонатаў сабраных з БССР, галярэя мае атрымаць яшчэ шмат абразоў і скульптураў ад Усесаюзнага Камітэту, які кіруе справамі мастацтваў.

— 17 — 19 лютага ў Менску адбываўся агульны сход Акадэміі Навук БССР, прысьвечаны абмеркаваньню вынікаў працы Акадэміі за 1938 год.

Як вынікае з справаздачы прэзыдэнта Акадэміі Горава, плян працы ня быў выкананы. З 92 тэмаў распрацавана толькі 61. У галіне выдавецкай таксама плян ня выкананы, нпр. паводле пляну павінна было быць выдадзеных друкам 52 працы, а яшчэ друкуюцца толькі 35.

Агулам кепска „працавала" Акадэмія Навук.

— 23—24 лютага ў Менску адбылася абласная нарада самадзейных мастакоў: скульптараў, рэзчыкаў на дрэве, ткачыхаў і вышывальніцаў. Усіх на нарадзе было 80 чалавек, з іх 60 з раёнаў Беларусі. З пасярод прысутных выявілася шмат здольных мастакоў—самадзейнікаў, якіх работы маюць высокую артыстычную вартасьць.

— Апошнім часам з закончаных твораў беларускіх савецкіх кампазытараў ужо вышлі ў сьвет, між іншымі: беларуская танцавальная сюіта Залатарова, сымфанічная паэма і соната для вальторны Аладава, соната для фартэпіяна Падкавырава, другая сымфонія і сюіта „Калгаснае сьвята" Шчэглова. У танцавальную сюіту ўваходзяць беларускія народныя танцы, як: „Бульба", „Крыжачок", „Юрачка", „Лявоніха" і „Мяцеліца".

— У сакавіку прыяжджалі з Масквы ў Менск спэцыялісты дзеля запісу на грамафонныя пліткі беларускіх музычных твораў. Запісана 60 твораў: урыўкаў з беларускіх опэраў, сымфанічнай музыкі і фалькльёру.

— У Менску, як і ў іншых гарадох і мястэчках Сав. Беларусі, адбыліся ўрачыстыя акадэміі, наладжаныя ў чэсьць 125-годзьдзя ад дня нараджэньня вялікага паэта і прарока Украінскага Народу Шэўчэнкі. Мы ўжо падавалі, што група беларускіх паэтаў пераклала на беларускую мову „Кабзара" і чарод меншых твораў Т. Шэўчэнкі.

— На дзень 9 сакавіка (на сьвята Шэўчэнкаўскае) выяжджала ў Кіеў дэлегацыя беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў у асобах Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, Бядулі, Броўкі і Глебкі. Пісьменьнікі завязьлі на юбілей Т. Шэўчэнкі пераклад „Кабзара" на беларускую мову.

— 10 сакавіка адбылося ў Менску адкрыцьцё новага будынку Дзяржаўнага Тэатру опэры і балету. У дзень адкрыцьця выстаўлялася першая беларуская сав. опэра „Міхась Падгорны".

— Кампазытары БССР рыхтуюцца да дэкады беларускага мастацтва, якая адбудзецца ў Маскве. Рад кампазытараў працуе над беларускім песенным фальклёрам.

— У Менску ідзе падрыхтоўка да разьмяшчэньня кіностудыі „Савецкая Беларусь", якая дасюль мясьцілася ў Ленінградзе. Перавозка інвэнтара ўжо пачалася.

Супрацоўнікі «Калосься»: *В. Багдановіч, А. Бужанскі, А. Бярозка, М. Васілёк, Ст. Грынкевіч, А. Дубровіч, Хв. Ільляшэвіч, А. Іверс, С. Каліна, А. Клімовіч, Я. Крыга, М. Машара, М. Пяцюкевіч, С. Сахараў, Кс. А. Станкевіч, Я. Станкевіч, П. Сірата, П. Сергіевіч, М. Танк, С. Хмара, А. Чэмер, Ул. Чэмер, М. Шкялёнак, Р. Шырма.*

Redaktor-Wydawca Jan Szutowicz   Рэдактар-Выдавец Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш. друкі

25 Сакавік, № 1, Вільня.
Lietuviškas Baras, № № 1, 2, 3, Вільня.
Вістник, кн. 2, 3, 4. Львоў.
Рідна Мова, ч. 1, 2.
Nasza Przyszłość, LXVII, LXIX. Варшава.
Sprawy Narodowościowe, № 4 - 5 з 1938 г. Варшава.
Kuźnica, № № 1—5. Катовіцы.
Polityka, № № 1—6. Варшава.
Sygnały, № № 60—66. Львоў.
Kamena, (55—56). Хэлм Люблінскі.
Prąd, I, II. Люблін.
Oriens, сш. 1. Варшава.
Fantana, № 3. Катовіцы.
Droga pracy, № 1. Крамянец.
Katolik, ч. 1—5. Прага.
Slavia, сш. 2—3. Прага.
Летопис Матице Српска, сш. 1, 2, 3. Новы сад.
Hrvatska Revija, № № 1, 2, 3, 4. Загрэб.

Ад Рэдакцыі і Адміністрацыі:

Друкарскі набор чарговага (2) нумару часапісу пачнецца ў палавіне красавіка. Просім дзеля гэтага Паважаных Супрацоўнікаў паруппіцца ў пару прыслаць да друку матарыялы.

Адміністрацыя „Калосься" прыпамінае і просіць усіх чытачоў, што ня прыслалі складак за мінулы год і не ўрэгулявалі за бягучы, зрабіць гэта якнайхутчэй. Складка ў год у краю — 2 зл., заграніцай 3.20. Нумар паштовага пераказу разрахунковага нашага часапісу 58.

